ЯКОЙ ТЭМПЕРАТУРЫ ВАРТА БАЯЦЦА 5

ПА СЛЯДАХ КРЫЖА ЕФРАСІННІ 6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

18 СТУДЗЕНЯ 2023 г.
СЕРАДА
№ 10 (29890)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ЛІЧБА ДНЯ

Br31,8 млрд

склала вытворчасць прадукцыі вёскі ў гаспадарках усіх катэгорый (у сельскагаспадарчых арганізацыях, сялянскіх (фермерскіх) гаспадарках, гаспадарках насельніцтва) у 2022 годзе. Гэта на 3,6 працэнта ў супастаўных цэнах больш у параўнанні з 2021 годам, паведаміў Нацыянальны статыстычны камітэт. У сельскагаспадарчых арганізацыях выраблена прадукцыі на Br25,6 млрд, або ў супастаўных цэнах на 2,9 працэнта больш, чым у адпаведны перыяд папярэдняга года. У гаспадарках усіх катэгорый выраблена 1,734 млн т жывёлы і птушкі ў жывой вазе, малака — 7,8 млн т і 3,4 млрд яек. Найбольшую ўдзельную вагу ў агульным аб'ёме вытворчасці прадукцыі сельскай гаспадаркі займаюць Мінская (26,4 працэнта) і Брэсцкая (22,2 працэнта) вобласці, далей ідуць Гродзенская (17,7 працэнта), Гомельская (12 працэнтаў), Віцебская (11,2 працэнта) і Магілёўская (10,4 працэнта) вобласці.

Студзень. Ураджай саспеў

Фота БелТА.

На ўнітарным прадпрыемстве «Рудакова» ў Віцебскім раёне пачалі збіраць агуркі новага ўраджаю.

На здымку: начальнік цэха Святлана БАРДЗЮКОВА.

КАРОТКА

- **Прадпрыемствы «Беллеспаперапрама» ў 2022 годзе нарасцілі аб'ёмы вытворчасці на 5 працэнтаў.**
- Іркуцкая вобласць зацікаўленая ў набыцці тэхнікі «АМКАДОР».
- **МАЗ паставіў 10 тралейбусаў з аўтаномным ходам у Разань.**
- Дзярждума РФ ратыфікавала пагадненне з Беларуссю аб узаемным прызнанні віз.
- **Прэзентацыі фільмаў, выставы і вечары-рэквіемы ў памяць аб ахвярах Халакосту пройдуць у Беларусі.**

ISSN 1990 — 763X

З нагоды

АДНА ПРАФЕСІЯ НА ДВАІХ

Для Мікіты і Марыны УКОЛАВЫХ Дзень ратавальніка Беларусі стаў яшчэ і сямейным святам

Тым, хто захапляецца пажарна-выратавальным спортам, хто такі Мікіта Уколаў, тлумачыць не трэба. Ён кумір хлопчыкаў і дзяўчынак, якія мараць звязаць сябе з высакароднай прафесіяй ратавальніка. За 14 апошніх гадоў ён неаднаразова станавіўся пераможцам і прызёрам міжнародных і рэспубліканскіх спаборніцтваў па пажарна-выратавальным спорце, устанавіў рэкорд Рэспублікі Беларусь у дысцыпліне «Уздым па штурмавых драбінах на 4-ы паверх вучэбнай вежы» ў памяшканнях. 12,7 секунды — менавіта столькі Мікіту трэба, каб узляцець з драбінамі на чацвёрты паверх. У Беларусі яму няма роўных па хуткасці. Мэта маладога чалавека — пабіць сусветны рэкорд 12,56 секунды, які застаецца пастаянным ужо на працягу 11 гадоў. Летась Прэзідэнт уручыў яму пасведчанне заслужанага майстра спорту Рэспублікі Беларусь.

СТАР. 3

Эксклюзіў «Звязды»

ЛІЧБАВАЕ І СТЫМУЛЯЦЫЙНАЕ РАЗВІЦЦЁ ЖКГ

Андрэй ХМЕЛЬ пра штучны інтэлект, даўгі за «камуналку» і смеццевыя бонусы

Павышэнне якасці і даступнасці жыллёва-камунальных паслуг, удасканаленне капітальнага рамонту жылля, памяншэнне колькасці ўтварэння і павелічэнне аб'ёмаў перапрацоўкі цвёрдых камунальных адходаў, абслугоўванне дамоў з прымяненнем ІТ-прадуктаў і лічбавая трансфармацыя сферы ЖКГ, добраўпарадкаванне двароў і гарадоў... Гэтыя і іншыя задачы, якія паўстаюць перад айчыннымі камунальнікамі, немагчыма вырашыць без інавацыйных тэхналогій і павышэння кампетэнцыі персаналу. Пакуль абмяркоўваюцца карэктывы, якія плануецца ўнесці ў Дырэктыву № 7 «Аб удасканаленні і развіцці жыллёва-камунальнай гаспадаркі краіны», міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Андрэй Хмель расказаў карэспандэнту «Звязды», як развіваюцца і працуюць камунальныя службы цяпер і што чакае іх у будучыні.

СТАР. 4

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ЁСЦЬ ДОБРЫЯ КАДРЫ — БУДЗЕ ВЫНІК»

У Палацы Незалежнасці — кадравы дзень. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даў згоду на назначэнне новых кіраўнікоў дзяржаўных вышэйшых навучальных установ, мясцовых выканаўчых і распарадчых, рэспубліканскіх органаў.

Кіраўнік дзяржавы даў згоду на прызначэнне Сяргея Каспяровіча рэктарам Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта, Аляксея Чуканава — рэктарам Віцебскага дзяржаўнага ордэна Дружбы народаў медыцынскага ўніверсітэта. Валянцін Пяшко ўзначаліць Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт. Кандыдатура Ірыны Паляковай узгоднена на пасаду старшыні Гарадоцкага раёна, кандыдатура Аляксандра Сысоева — на пасаду кіраўніка адміністрацыі Чыгуначнага раёна горада Віцебска.

Прэзідэнт узгадніў кандыдатуру Аляксандра Бахановіча на пасаду першага намесніка міністра адукацыі, а Паўла Лемеха — на пасаду намесніка міністра фінансаў. Алег Воінаў зойме пасаду дырэктара Дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі. Кандыдатура Юрыя Пернача ўзгоднена на пасаду кіраўніка спраў Віцебскага аблвыканкама. Вольга Петрашова пераходзіць на пасаду першага намесніка адказнага сакратара Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі. Наталля Белакапытава — новы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення прававога і дакументацыйнага забеспячэння Сакратарыята Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі.

«Час гэтыя ўсе пературбацыі заканчваць»

«Мы задумалі вельмі сур'ёзную рэарганізацыю, перш за ўсё ў сістэме адукацыі. Аб гэтым я ўжо неаднойчы гаварыў. Але вывад быў адназначны. Час гэтыя ўсе пературбацыі і рэарганізацыі заканчваць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, назначаючы рэктараў ВНУ. Ён нагадаў пра сваё даручэнне сур'ёзна паглядзець на Міністэрства адукацыі, каб там не было лішніх структур. Як прыклад — праблемныя моманты, звязаныя з перабудовай некаторых элементаў структуры Міністэрства адукацыі і падначаленых яму арганізацый. У прыватнасці, гэта датычыцца работы Дэпартамента кантролю якасці адукацыі і створанага нядаўна Нацыянальнага агенцтва па забеспячэнні якасці адукацыі.

❍ У тэму

Найважнейшая задача — фарміраванне грамадзяніна

Новы рэктар Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта Сяргей КАСПЯРОВІЧ у размове з журналістамі заўважыў, што сістэма адукацыі ніколі не стаяла і не будзе стаяць на месцы, яна пастаянна ўдасканальвалася і працягне ўдасканальвацца. «Але вельмі важна, каб гэтыя рухі былі, я сказаў бы, не рэвалюцыйнымі. Сістэма адукацыі павінна валодаць пэўнай кансерватыўнасцю. Мы павінны ад таго лепшага, што ў нас ёсць, рухацца наперад», — сказаў ён. Як прыклад ён прывёў змяненні ў парадку паступлення ў ВНУ, у далейшым будзе абноўлены змест вышэйшай адукацыі. «Трансфармацыю праходзіць і магістарская падрыхтоўка, і адукацыя пасля ВНУ. Важным пытаннем застаецца кадравае забеспячэнне ўстаноў агульнай сярэдняй і дашкольнай адукацыі, пытанні, звязаныя з забеспячэннем ВНУ кваліфікаванымі выкладчыкамі. А гэта ў першую чаргу навука, развіццё навуковай дзейнасці. Мы павінны разумець, што ў сістэме адукацыі найважнейшая задача — фарміраванне нашага грамадзяніна, які можа працаваць на карысць краіне, быць патрыётам і, вядома, умець ацэньваць рэальную сітуацыю», — сказаў Сяргей Каспяровіч.

Ірына ПАЛЯКОВА, новая старшыня Гарадоцкага райвыканкама, падкрэсліла, што найпершая задача для рэгіёна — эканамічнае развіццё. «У першую чаргу, мы будзем працаваць над узроўнем развіцця сельскай гаспадаркі, ёсць прадпрыемствы ў раёне, узровень якіх трэба падцягнуць. 2023 год для Гарадоцкага раёна вельмі адказны, у верасні раён прыме Дзень беларускага пісьменства. Ужо пачалася актыўная падрыхтоўка да гэтага свята. Задач стаіць шмат, але я думаю, што з той камандай і тымі людзьмі і кадрамі, якія працуюць у раёне, мы справімся з гэтымі задачамі», — сказала яна.

Сяргей Каспяровіч, узгоднены на пасаду рэктара Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта, а да гэтага дня начальнік галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Мінадукацыі, пасля мерапрыемства ў размове з журналістамі падкрэсліў, што любыя прапановы па ўдасканаленні, рэарганізацыі сістэмы адукацыі заўсёды вельмі сур'ёзна ўзважваюцца, абмяркоўваюцца на ўзроўні кіраўніка дзяржавы. Ён адзначыў, што ў пытаннях наконт дзейнасці дэпартамента і агенцтва канчатковыя рашэнні яшчэ не прыняты. «Тут ёсць разуменне неабходнасці ўдасканалення гэтай работы, павышэння эфектыўнасці», — сказаў спецыяліст.

«Нельга крыўдзіць людзей»

Разглядаючы кадравыя пытанні, Прэзідэнт падкрэсліў, што незалежна ад сферы дзейнасці, кіраўнікам нельга крыўдзіць людзей. Асабліва сёння, у такі няпросты час. «Гэта датычыцца і вас як кіраўнікоў, і сістэмы органаў улады, асабліва кіраўнікоў адміністрацый, райвыканкамаў. Трэба ўважлівым чынам да гэтага падыходзіць. А не тое, што «ты не спадабаўся, я цябе зніму...». Нам трэба ўзмацніць кантроль за работай кадраў. Трэба глядзець: звольнілі намесніка ці яшчэ кагосьці нават у райвыканкаме — мы гэта павінны бачыць і даваць ацэнку губернатару і старшыням райвыканкамаў. Калі заслугоўвае, не цягне воз, лайдак, а можа быць, яшчэ горш — вораг, то што тут размаўляць — размаўляць няма чаго. Калі чалавек недацягвае ў нечым, малады чалавек, яшчэ не вельмі разумее, мала папрацаваў, папрацуйце з ім. І ён дасць вынік, я ўпэўнены. А проста выкідваць людзей нельга», — заявіў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючы ўвагу, што да кадраў трэба ставіцца акуратна.

«Калі прафесіянал, калі адданы краіне і гатовы працаваць — з ім трэба працаваць. Нельга махаць налева і направа шашкай. Ёсць добрыя кадры — будзе вынік. Тым больш гаворка ідзе аб кіраўніках высокага ўзроўню. Калі яны на месцы, моцныя — будзе вынік... Усё залежыць ад кіраўніка працэнтаў на 90 у любой справе. Гэта павінна быць для ўсіх законам і навукай», — сказаў беларускі лідар. Ён параіў заўсёды даваць шанц чалавеку. Калі той памыліўся, спатыкнуўся, — даць яму час, дапамагчы, раптам з яго нешта атрымаецца.

«За намі ж глядзяць людзі. Калі мы будзем размахваць шашкай налева-направа, сячы галовы, якая работа будзе? Не будзе. Навошта чалавеку такая работа? Ён увесь час будзе ў стрэсавай сітуацыі. У яго ні сям'і не будзе, ні справы, да якой ён прыстаўлены. Глядзіце, гэта галоўнае для вас, вы кіраўнікі», — падсумаваў Аляксандр Лукашэнка.

Валерыя СЦЯЦКО.

Нашы дзеці

Больш за мільён хлопчыкаў і дзяўчынак

ахапілі мерапрыемствамі акцыі

Днямі завяршылася дабрачынная акцыя «Нашы дзеці». У ёй узяло ўдзел больш за 20 тысяч юных беларусаў, усяго ж мерапрыемствамі акцыі па краіне ахапілі больш як мільён дзяцей. Прычым сёлета да яе далучыліся дзеці з Данбаса, Расіі, Літвы і Латвіі. Каля 55 тысяч рублёў сабрана падчас акцыі на рахунку Беларускага дзіцячага фонду, сродкі будуць накіраваны на набыццё абсталявання для дзяцей з аўтызмам.

Традыцыйна ў акцыі ўдзельнічалі вышэйшыя службовыя асобы, кіраўнікі рэспубліканскіх, абласных, раённых органаў дзяржкіравання, старшыні канцэрнаў, банкаў, найбуйнейшых рэспубліканскіх грамадскіх аб'яднанняў. На працягу апошніх гадоў склаліся традыцыі замацавання шэфскіх адносін паміж прадпрыемствамі і арганізацыямі і дзіцячымі ўстановамі. І ўжо каля 130 арганізацый узяло апеку над дзецьмі і наведвае іх з розных нагод: падчас Міжнароднага дня абароны дзяцей, падрыхтоўкі да новага навучальнага года, Дня інвалідаў і іншага.

Сёлета традыцыйна партнёрам акцыі выступіў Беларускі дзіцячы фонд. На яго спецыяльныя рахункі пералічыць грошы маглі ўсе ахвотныя — грамадзяне і прыватныя арганізацыі. У выніку паступіла больш за 54 тысячы рублёў — сума перавышае мінулагоднюю. У найбліжэйшы час рахункі будуць закрыты, а на сабраныя сродкі закупяць абсталяванне для дыягностыкі і лячэння дзяцей, хворых на аўтызм.

Як адзначыла **намеснік начальніка ўпраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы Міністэрства адукацыі Алена СІМАКОВА,** у кожным рэгіёне былі арганізаваны свае мерапрыемствы, якія дазваляюць зрабіць акцыю разнастайнай і адрозніваюць яе ад папярэдніх.

Галоўнай падзеяй традыцыйна стала дабрачыннае прадстаўленне «Сузор'е зубра» — навагодняе дзіцячае свята з удзелам кіраўніка дзяржавы, якое адбылося 29 снежня 2022 года ў Палацы Рэспублікі. У мерапрыемстве, акрамя беларускіх дзяцей, якія традыцыйна прыязджаюць з усіх рэгіёнаў у Мінск, узялі ўдзел 48 дзяцей з Лісічанска, што знаходзіліся ў гэты час на аздараўленні ў Наваполацку.

— Акцыя выходзіць за межы нашай краіны. У ёй узялі ўдзел хлопчыкі і дзяўчынкі з Данбаса, якія былі запрошаны ў нашу краіну дабрачынным фондам імя Аляксея Талая. Таксама ў святочных мерапрыемствах удзельнічалі дзеці з Расіі, Латвіі і Літвы. Яны прыехалі ў Беларусь па запрашэнні пры садзейнічанні Міністэрства замежных спраў, — расказала Алена Сімакова.

Акрамя мерапрыемства ў Палацы Рэспублікі, акцыя «Нашы дзеці» традыцыйна ўключала некалькі прадстаўленняў у сталічным Палацы Незалежнасці. Яны прайшлі 4, 5 і 6 студзеня 2023 года. Былі запрошаны дзеці з усіх рэгіёнаў краіны. Акцэнт — на малых з прыёмных, апякунскіх і малазабяспечаных сем'яў. Усе мерапрыемствы арганізаваны пры падтрымцы Мінгарвыканкама.

Плённа прайшлі мерапрыемствы акцыі ў рэгіёнах. У Мінскай вобласці галоўнае свята было арганізавана ў Жодзіне, куды запрасілі дзяцей з усіх раёнаў вобласці. Толькі на Міншчыне сабрана з розных крыніц больш за мільён рублёў.

— Гэта і бюджэтныя сродкі, якія найперш пайшлі на набыццё падарункаў і арганізацыю святочных мерапрыемстваў, і небюджэтныя, якія сталі спонсарскай дапамогай арганізацыям і ўстановам, што выхоўваюць дзяцей, — дадала Алена Сімакова.

У Гродзенскай вобласці цэнтральнай падзеяй стала навагоднае свята з удзелам кіраўніка аблвыканкама, а моладзь сабрaў навагодні баль у стылі «Карнавальнай ночы». Усе 26 дзіцячых дамоў сямейнага тыпу ў рэгіёне былі ахоплены мерапрыемствамі акцыі «Нашы дзеці», ім была аказана дапамога на суму звыш 55 тысяч рублёў.

Як адзначыла Алена Сімакова, калі параўноўваць сённяшнюю акцыю «Нашы дзеці» з яе пачатковымі мерапрыемствамі ў сярэдзіне 1990-х, то адрозніваюцца і ўдзельнікі, і маштаб.

— У 1995 годзе арганізацыямі дапамогі былі інтэрнатныя ўстановы, і тады іх было каля 50. Толькі іх спіс займаў амаль увесь графік акцыі. Сёння дзіцячых інтэрнатаў засталося ўсяго 12, і гэта не асноўны акцэнт, які робіцца падчас акцыі. Сёння дапамогу і клопат атрымліваюць дзясяткі тысяч самых розных дзяцей.

Алена КРАВЕЦ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Большасць жыхароў Японіі выступіла супраць павышэння падаткаў дзеля абаронных патрэб

Большасць жыхароў Японіі выступае супраць павышэння якіх-небудзь падаткаў дзеля павелічэння асігнаванняў на абарону ў рамках новай стратэгіі нацыянальнай бяспекі. Пра гэта сведчаць даныя апытання, праведзенага найбуйнейшай газетай краіны Yomiuri. Так, прынамсі 63 працэнты рэспандэнтаў выступілі супраць павышэння падаткаў дзеля абаронных патрэб. Падтрымалі ініцыятыву ўрада на чале з прэм'ер-міністрам Фуміа Кісіда толькі 28 працэнтаў удзельнікаў апытання. Адметна, што нават сярод прыхільнікаў кіруючага блока на чале з Ліберальна-дэмакратычнай партыяй 43 працэнты апытаных падтрымалі ініцыятыву павышэння абаронных расходаў, а 49 % выступілі супраць. Але нават сярод прыхільнікаў неабходнасці павышэння абаронных выдаткаў 40 працэнтаў выступілі супраць ідэі падняць падаткі дзеля гэтых мэт.

Французскія прафсаюзы паведамілі аб пратэстах супраць пенсіённай рэформы

Прафсаюзы Францыі плануюць з 19 студзеня акцыі пратэсту і маніфестацыі супраць новай пенсіённай рэформы. Аб гэтым паведаміла РІА «Навіны» са спасылкай на генеральнага сакратара прафсаюза «Французская дэмакратычная канфедэрацыя працы» Ларана Бергера. Прэм'ер-міністр Францыі Элізабэт Борн апублікавала праект неадназначнай пенсіённай рэформы, якую мяркуюць увесці ўжо сёлета. Улады будуць павялічваць пенсіённы ўзрост у краіне на тры месяцы на год з 1 верасня 2023-га. Такім чынам, да 2030-га ён дасягне 64 гадоў. Ларан Бергер акцэнтаваў увагу, што гэта «адна з самых жорсткіх пенсіённых рэформаў за апошнія 30 гадоў».

У выніку паводак у Каліфорніі загінулі 20 чалавек

Як заявіў губернатар Каліфорніі Гэвін Ньюсам, у выніку паводак, якія абрынуліся на амерыканскі штат з 26 снежня, загінулі 20 чалавек, дзясяткі тысяч людзей па-ранейшаму знаходзяцца ў эвакуацыі. Пра гэта паведаміла агенцтва Reuters. Тым часам Нацыянальная метэаралагічная служба ЗША перадала, што моцны дождж пачаў сціхаць. Прэзідэнт краіны Джо Байдэн плануе наведаць пацярпелыя ў выніку стыхіі раёны для ацэнкі ўрону і планавання далейшай федэральнай падтрымкі. Раней амерыканскі лідар аб'явіў аб увядзенні рэжыму надзвычайнай сітуацыі ў штаце Каліфорнія ў сувязі з бесперапыннымі ліўнямі і штормам. Многія раёны дагэтуль застаюцца без электрычнасці. Паводкі ператварылі вуліцы гарадоў у рэкі, у выніку апоўзняў многія з трас заблакіраваныя для руху.

Навука

АД КОСМАСУ ДА ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

Выстаўка «Беларусь інтэлектуальная» пройдзе ў Нацыянальным выставачным цэнтры «БелЭкспа» з 20 да 22 студзеня. У выхадныя дні яе змогуць наведаць не толькі мінчане, але і жыхары з іншых рэгіёнаў краіны, студэнты, школьнікі і ўвогуле ўсе, хто захапляецца навукай.

— Паверце, там будзе што паглядзець і чаму здзівіцца, — запэўнівае **першы намеснік старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Сяргей ЧЫЖЫК.** — Яшчэ на стадыі фарміравання экспазіцыі мы рабілі ўстаноўку на тое, каб яна была насамрэч новай, свежай і каб уражвала. І хоць даручэнне аб арганізацыі гэтай выстаўкі было дадзена кіраўніком дзяржавы менавіта нам, выстаўка будзе міжведамасная, бо Нацыянальная акадэмія навук — далёка не ўся навука ў краіне. У Беларусі сёння зарэгістравана 239 навуковых арганізацый: 78 з іх знаходзяцца ў структуры НАН, 35 — у ведамстве Міністэрства адукацыі, 26 адносяцца да Міністэрства аховы здароўя, 18 — да Міністэрства прамысловасці і гэтак далей. У выстаўцы будуць удзельнічаць 20 ведамстваў.

Уся экспазіцыя падзелена па некалькіх кластарах: сярод іх — «Штучны інтэлект, IT-тэхналогіі і робататэхніка», «Інавацыйнае прыборабудаванне», «Электратранспарт і яго базавыя кампаненты», «Абараназдольнасць і ваенная навука», «Экалогія і прыродакарыстанне», «Біятэхналогіі», «Фармацыя, ахова здароўя, медыцына», «Аграпрамысловы комплекс і харчаванне», а таксама «Прастора маладзёжных ініцыятыў». Чакаецца, што на выстаўцы будзе прадстаўлена каля 400 узораў, у тым ліку буйнагабарытная тэхніка ад Мінпрама, якая размесціцца на вулічнай пляцоўцы побач з выставачным цэнтрам.

«Выстаўка максімальна інтэрактыўная. Фізікі прадэманструюць зусім новыя рэчы, напрыклад, перадачу інфармацыі ў космасе з дапамогай лазера. Гэта найважнейшая задача для далейшага асваення касмічнай прасторы, — падкрэсліў Сяргей Чыжык. — Будзе паказана перадача тэлевізійных файлаў з высокім распазнаннем пры дапамозе лазернага промня. Таксама прадставяць і сістэму хуткага тэст-аналізу на вірус шляхам сканавання прабірак з узорамі. Прадставяць звышадчувальныя цеплавізарныя сістэмы, а таксама лазерныя дальнамеры, якія вымяраюць з дакладнасцю да міліметра адлегласці да 1 кіламетра, сістэмы для выяўлення ваганняў, у прыватнасці ў раёне БелАЭС. Акрамя таго, прэзентуюць новыя матэрыялы, у прыватнасці штучныя беларускія ізумруды. Нам удаецца вырасціць насамрэч буйныя экзэмпляры — памерам з грэцкі арэх, да 50 каратаў. Гэта высокае дасягненне.

Акадэмія навук прадставіць таксама тры ўзоры электратранспарту: два каркасныя электрамабілі і спорткар. Узровень іх лакалізацыі блізкі да 90 працэнтаў. І, самае галоўнае, будуць прадстаўлены кампаненты. Гэта нашы эфектыўныя электрарухавікі, якія прыняты на вытворчасць «Магілёўліфтмашам», айчынная электроніка (завод «Вымяральнік»). Кампаненты прадставяць і рэзідэнты «Вялікага каменя». Пакажам, як мы прасунуліся па электраназапашвальніку. Сёння гэта ключавое пытанне. Літый-іонныя ячэйкі для батарэй у асноўным пастаўляюцца з Кітая. А мы прадставім натрый-іонныя ячэйкі: літый замяняецца на натрый, гэта значыць, на больш танны матэрыял. Але гэта пакуль толькі лабараторны вынік.

Як заўважыў **міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ,** сёння ва ўніверсітэтах і тэхнапарках пры ВНУ працуюць 2 тысячы даследчыкаў. А ўвогуле ў краіне кожны пяты даследчык — малады вучоны. Пры адборы ўдзельнікаў, навуковыя вынікі якіх будуць прадстаўлены ў «Прасторы маладзёжных ініцыятыў», перавага аддавалася лаўрэатам спецфонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, выпускнікам Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка, пераможцам рэспубліканскага конкурсу «100 ідэй для Беларусі».

«Сёння ў нашай краіне створаны ўсе ўмовы для падтрымкі і выяўлення талентаў, пачынаючы са школы, — падкрэсліў Андрэй Іванец. — Фактычна два гады ў пілотным рэжыме функцыянуе Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк. Цяпер там рэалізоўваецца ўжо 15 адукацыйных праграм — ад космасу да біятэхналогій. Штомесяц каля 150 хлопчыкаў і дзяўчынак праходзяць праграмы навучання, якія ўключаюць і выкананне ўласных навукова-даследчых работ. Гэта адбываецца на базе навуковых арганізацый сістэмы Міністэрства адукацыі, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, іншых міністэрстваў і ведамстваў. Больш за тое, з прыняццем Указа № 2 кіраўніка дзяржавы выбудавана новая траекторыя прафесійнага і адукацыйнага развіцця найбольш паспяховых выпускнікоў дзіцячага тэхнапарка. Па рэкамендацыі Нацыянальнага савета тэхнапарка маладыя людзі, якія паспяхова прайшлі навучанне, змогуць паступаць ва ўніверсітэты па гутарцы, без экзаменаў. Гэта вельмі важна для таго, каб таленавітыя дзеці прыходзілі ў вядучыя ВНУ, а пасля ішлі на навуковыя і інавацыйныя прадпрыемствы. Пералік спецыяльнасцяў і ВНУ, якія будуць адпавядаць пятнаццаці профілям навучання ў тэхнапарку, куды яго выпускнікі змогуць паступаць без экзаменаў, будзе вызначаны да 15 лютага».

На выстаўцы «Беларусь інтэлектуальная» ўніверсітэцкая навука прадставіць відэаспектральнае абсталяванне, у тым ліку тое, што ўжо выкарыстоўваецца на расійскім сегменце Міжнароднай касмічнай станцыі. Але маладыя навукоўцы БДУ распрацавалі ўжо новае пакаленне сістэмы арыентацыі відэаспектральнай апаратуры «САВА-2». Будзе прадстаўлены і новы ўніверсітэцкі нанаспадарожнік, які ў БДУ плануюць запусціць на арбіту ў бягучым годзе. Яго кампаноўчная база і магчымасці, у тым ліку і ў плане выкарыстання ў адукацыйным працэсе, істотна пашырыліся ў параўнанні з першым нанаспадарожнікам, запушчаным на арбіту ў 2018 годзе.

У медыцынскім раздзеле будуць прадстаўлены імпланты, штучны клапан сэрца, эндапратэз каленнага сустава, вектарная канструкцыя ДНК-вакцыны для лячэння анкалагічных захворванняў. Адназначна наведвальнікаў зацікавіць біяраскладальная «разумная» ўпакоўка, біяраскладальны аналаг тэтрапака і харчовы 3D-прынцінг, які дазваляе рэалізаваць ідэі персаналізаванага харчавання.

Асобна будуць прадстаўлены навуковыя распрацоўкі, накіраваныя на патрыятычнае выхаванне.

Надзея НІКАЛАЕВА.

АДНА ПРАФЕСІЯ НА ДВАІХ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Абаяльная ўсмешка Мікіты Уколава, напэўна, многім дзяўчатам разбіла сэрца. Але сэрца маладога чалавека цалкам аддадзена яго паплечніцы па службе Марыне. Так склалася, што менавіта прафесія звяла прыгажуню з Брэсцкай вобласці і спартыўнага магіляўчаніна.

— Я тады працавала ў цэнтры арганізацыі спартыўна-масавай работы, рыхтавала дакументы спартсменаў перад чэмпіянатам свету па пажарна-выратавальным спорце, — успамінае Марына дзень іх першага знаёмства. — Трэба было ўдакладніць некаторыя дадзеныя кандыдатаў на паездку. Але Мікіта затрымаўся каля мяне болей, чым астатнія. Прычым задаваў мне больш пытанняў, чым я яму. Потым стаў часта прыходзіць у госці. Мы пачалі сустракацца, а праз два гады ён зрабіў мне прапанову стаць яго спадарожніцай жыцця. Прычым вельмі прыгожа і рамантычна — на беразе Міжземнага мора. Вядома, як і любая дзяўчына, я марыла пра сям'ю, пра тое, што каханы зробіць мне прапанову. Але ўсё роўна атрымалася нечакана. Было вельмі кранальна і рамантычна, у гэты момант я была неверагодна шчаслівая, бо самы выдатны чалавек на свеце абраў менавіта мяне.

Вядома, жыццё не казка, кожнага яно выпрабоўвае на трываласць. Але і Мікіта, і Марына байцы па характары. Ён інжынер сувязі пажарнага аварыйна-выратавальнага атрада Магілёўскага абласнога ўпраўлення МНС. Дзякуючы падтрымцы кіраўніцтва і калег у яго атрымліваецца сумяшчаць работу і трэніроўкі. Бо жаданне пабіць сусветны рэкорд па ўздыме з драбінамі на чацвёрты паверх — яго мара.

Марына ставіцца да планаў мужа з разуменнем. Бо сама ўпарта ішла да мэты стаць афіцэрам пажарнай службы. Калі пры паступленні не хапіла балаў, выратавала вучыцца платна. Але хутка яе перавялі на бюджэт. Яна даказала і сабе, і ўсім астатнім, што правільна зрабіла свой выбар. Курсантка ваенна-інжынернага інстытута з першых дзён вучобы заваявала аўтарытэт сярод выкладчыкаў і будучых калег. На другім курсе вышэйшая ўстанова вылучыла яе на ўдзел у конкурсе «Студэнт года — 2015». Марына ўвайшла ў пяцёрку лепшых студэнтаў Беларусі. Падчас вучобы ў ВНУ дзяўчына добра праявіла сябе ў грамадскай дзейнасці. Пэўны час прадстаўляла інтарэсы таварышаў па вучобе ў Маладзёжным парламенце пры Мінскім гарсавеце дэпутатаў. Была сакратаром універсітэцкай пярвічкі БРСМ. За час навучання дзяўчына неаднаразова станавілася пераможцай алімпіяд па розных дысцыплінах, прымала ўдзел у навукова-практычных канферэнцыях, урачыстых і спартыўных мерапрыемствах.

Першым месцам яе работы стаў цэнтр арганізацыі спартыўна-масавай работы Дзяржаўнай пажарнай аварыйна-выратавальнай установы «Рэспубліканскі атрад спецыяльнага прызначэння» МНС Рэспублікі Беларусь. Там яна і пазнаёмілася з Мікітам. А калі яны вырашылі звязаць свае жыцці, рашуча памяняла сталіцу на абласны цэнтр.

— Мы нават не разглядалі варыянт жыцця па розных гарадах. Я, зразумела, вельмі люблю родны Пінск, але для мужа як для прафесійнага спартсмена там няма магчымасці трэніравацца. Родны горад Мікіты мне вельмі спадабаўся, дзякуючы мужу вельмі хутка да яго прывыкла. А яшчэ мне вельмі пашчасціла — трапіла ў выдатны калектыў цэнтра біяспекі жыццядзейнасці, які мяне добразычліва прыняў.

Зараз Марына больш увагі прысвячае сям'і, знаходзіцца ў дэкрэтным водпуску і даглядае пяцімесячнага Арсенія. Мікіта аказаўся не толькі таленавітым спартсменам і пяшчотным мужам, але і выдатным бацькам. Ён робіць спецыяльную гімнастыку з маленькім сынам, дапамагае жонцы купаць яго. Маладая маці заўсёды можа разлічваць на моцнае плячо мужа. Калі трэба, ён і ноччу да малога ўстане, і накорміць.

— Мікіта вельмі добры, надзейны, у яго ідэальнае пачуццё гумару, — характарызуе жонка мужа.

Першы час яна хвалявалася, калі ён выступаў на спаборніцтвах, але хутка зразумела, што Мікіта — прафесіянал і спраўляецца са сваёй задачай па-майстэрску. Ды і прафесія абавязвае быць упэўненым.

— Я вельмі ганаруся ім, — кажа суразмоўніца. — Ведаю, што ён даб'ецца шмат чаго ў жыцці, і ўсе галоўныя яго перамогі яшчэ наперадзе.

— Для мяне Марына з'яўляецца велізарным стымулам, — прызнаецца Мікіта. — Яна часта прысутнічае на рэспубліканскіх спаборніцтвах у якасці суддзі-інфарматара. Я заўсёды бачу, як яна перажывае за мяне, падтрымлівае, і гэта прымушае мяне рабіць сваю справу яшчэ лепш.

У вольны час муж і жонка аддаюць перавагу актыўнаму адпачынку: гуляюць па горадзе, ходзяць у басейн, на батуты, у кіно, ездзяць да родных Марыны ў Пінск.

— У нас грандыёзныя планы на будучыню, — дзеляцца сужэнцы. — Марым аб сваім утульным жыллі, у якім будзе гучаць дзіцячы смех і брэх сабакі. Пакуль жывём у арэндным.

Ці стане Арсеній прадаўжальнікам сямейнай прафесіі, яшчэ невядома. Хоць, як прызналася Марына, Мікіта яго ўжо рыхтуе да будучых стартаў. Быць ратавальнікам ганарова і адказна. Бо нічога няма больш высакароднага, як ратаваць жыцці людзей.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота з архіва абласнога ўпраўлення МНС і сям'і Уколавых.

У тэму

Старшы інспектар Магілёўскага абласнога ўпраўлення МНС Вольга НЕХАРОШЫХ:

— Штогод у Магілёўскай вобласці адбываецца больш за 700 надзвычайных сітуацый, гіне каля 100 чалавек. І кожнае выратаванае жыццё — гэта вялікая перамога. Нашы супрацоўнікі робяць усё для таго, каб мір і спакой былі ў кожнай сям'і, каб былі жывыя родныя і захаваўся дах над галавой. За 2022 год на тэрыторыі Магілёўшчыны пры надзвычайных сітуацыях, пажарах, аварыях і катастрофах быў выратаваны 131 чалавек, больш за 45 жывёлін, адваяваныя ў стыхіі 298 будынкаў, 62 адзінкі тэхнікі. У параўнанні з 2021 годам пажараў на Магілёўшчыне паменшылася на 8 працэнтаў, а колькасць загінулых скарацілася на 25 працэнтаў.

ЛІЧБАВАЕ І СТЫМУЛЯЦЫЙНАЕ РАЗВІЦЦЁ ЖКГ

Для інвентарызацыі і раскопак

— У Беларусі актыўна развіваецца дзяржаўная інфармацыйная сістэма «Жыллёва-камунальная гаспадарка», якая аб'ядноўвае шэраг інфармацыйных сістэм і картаграфічных рэсурсаў, што прапаноўваюць сэрвісы грамадзянам, бізнесу і дзяржаве. Раскажыце, калі ласка, аб развіцці новых тэхналогій і лічбавізацыі галіны ЖКГ.

— Лічбавізацыя — трэнд, які ў краіне трэба актыўна развіваць і ўдасканальваць, у тым ліку і ў галіне ЖКГ. Пакрысе мы рухаемся да дыстанцыйнага здымання паказчыкаў спажытай энергіі, лічбавай трансфармацыі працэсаў кіравання жыллём і шмат да чаго іншага. Некаторыя рэчы ўжо актыўна выкарыстоўваюцца.

Напрыклад, аўтаматызаваная інфармацыйная сістэма «ДомУлік», створаная для кіравання вытворча-тэхнічнай і эканамічнай дзейнасцю прадпрыемстваў ЖКГ, функцыянуе ў шэрагу гарадоў краіны і цяпер укараняецца ў сталіцы. Сістэма збірае, апрацоўвае і ўлічвае аб'ектыўную інфармацыю пра тэхнічны стан жылых будынкаў для рацыянальнага размеркавання рэсурсаў, якія накіроўваюцца на падтрыманне жылфонду, і кантролю эфектыўнасці іх расходавання. Аўтаматызацыя бізнес-працэсаў прадпрыемстваў ЖКГ накіравана на знižэнне кошту і павышэнне якасці паслуг насельніцтву шляхам эфектыўнага ўліку працоўных, матэрыяльных, фінансавых рэсурсаў прадпрыемства. У далейшым плануецца распаўсюдзіць работу «ДомУлік» на ўсе астатнія рэгіёны краіны.

З дапамогай «Інтэрактыўнай карты» — праграмнага прадукту, які ўяўляе сабой адзіны картаграфічны сэрвіс ЖКГ на ўзроўні сталіцы, — плануецца аптымізаваць працэс па стварэнні інвентарызацыйных ведамасцяў. Падчас лічбавай інвентарызацыі аб'екты жыллёва-камунальнай гаспадаркі, вулічна-дарожнай сеткі, добраўпарадкавання і прыдамавых тэрыторый сталіцы будуць адлюстроўвацца ў гэтым рэсурсе. Такім чынам будуць створаны ўмовы для павелічэння празрыстасці і даступнасці інфармацыі аб усіх аб'ектах.

Дзякуючы «Інтэрактыўнай карце» мяркуецца таксама планаваць і кантраляваць якасць утрымання яе асобных складаных кампанентаў (праезнай часткі, пешаходнай зоны і пераходаў, бартавога каменю, прыпыначных пунктаў і малых архітэктурных формаў). Прадугледжана магчымасць наносіць на карту інфармацыю аб тыпах пакрыцця тэрыторый, іх плошчы, дакладным месцазнаходжанні асобных аб'ектаў па каардынатах, колькасным і якасным стане аб'ектаў і плошчаў участкаў.

Цяпер на «Інтэрактыўнай карце» адлюстраваны тэрыторыі, якія замацаваны за юрыдычнымі і фізічнымі асобамі, а таксама за індывідуальнымі прадпрымальнікамі, для выканання на гэтых плошчах работ па падтрыманні належнага санітарнага стану. Абазначаны таксама тэрыторыі зямель агульнага карыстання для падтрымання іх санітарна-тэхнічнага стану. Карта паспяхова эксплуатуецца ў Мінску і Гродне, а напрыканцы 2022-га запрацавала ў Віцебску і Лідзе.

Летась у красавіку створаны картаграфічны сэрвіс правядзення плановых раскопак у сталіцы — інфармацыйная сістэма «Інжынерныя сеткі». На гэтую карту нанесены ўсе планы па работах уладальнікаў інжынерных сетак у Мінску. Выкарыстанне гэтага праграмнага прадукту ў гаспадарчай дзейнасці ўладальнікаў тэрытарый, інжынерных сетак дазволіць пазбягаць канфліктных сітуацый пры правядзенні работ. Гэта таксама дапаможа вырашыць задачу па памяншэнні колькасці паўторных раскопак на адной тэрыторыі, павысіць якасць работ за кошт зніжэння колькасці памылак у планаванні работ, аптымізаваць фінансавыя расходы на добраўпарадкаванне тэрыторыі.

Кантроль якасці і тэрмінаў выканання службы «115»

— Ці павялічваецца аператыўнасць і якасць рэагавання службы «115» на прэтэнзіі і заявы жыхароў? Як будзе развівацца гэтая служба далей і якія пытанні застаюцца найбольш актуальнымі?

— Партал «Мая Рэспубліка» 115.бел, які часцей называюць проста «служба «115», — гэта публічная вітрына даных «Аўтаматызаванай сістэмы «Дыспетчарская служба». На іх базе створана адзіная інфармацыйная сістэма — рэспубліканскі праграмны прадукт для работы з заявамі і зваротамі грамадзян па пытаннях неаказання жыллёва-камунальных паслуг або іх аказання з недахопамі. Звярнуцца з пытаннем жыхары могуць як праз партал, так і з дапамогай мабільнай праграмы альбо пазваніўшы на адзіны тэлефонны нумар 115.

Тэхнічны аператар сістэмы — прадпрыемства «Цэнтр інфармацыйных тэхналогій», які і займаецца ўдасканаленнем работы партала і ўсёй сістэмы. Прычым частка работ у гэтым кірунку праводзіцца па прапановах арганізацый ЖКГ, а частка — па прапановах, накіраваных у цэнтр грамадзянамі.

Штогод у службу «115» паступае каля 4,6 млн званкоў, а на партале рэгіструецца каля 300 тысяч заяў. Найбольш актуальныя пытанні ад насельніцтва датычацца відаў работ: цепла- і электразабеспячэння, санітарнага стану і добраўпарадкавання тэрыторыі, водазабеспячэння, капрамонту.

Заўважу, што створаная сёння ў ЖКГ сістэма зваротнай сувязі са спажыўцом уяўляе сабой не толькі прыём заяў ад насельніцтва і перадачу іх выканаўцам. Кантралюецца якасць выканання работ, аналізуюцца звароты, грамадзяне атрымліваюць кансультацыі па розных пытаннях, а меркаванне жыхароў улічваецца пры плянаванні работ. Такім чынам мы аналізуем, выяўляем праблемныя моманты, спрашчаем атрымманне паслуг.

Якасць выкананых работ пасля заяўкі на кароткі нумар 115 пацвярджаецца шляхам тэлефоннага абзвону спажыўцоў, якія пакідалі заяўку. Калі чалавек не пацвердзіў факт выканання або ў яго ёсць заўвагі па якасці праведзеных работ, заявы накіроўваюцца на дапрацоўку.

Мы дакладна ўсведамляем неабходнасць недапушчэння фармальнага стаўлення да праблем грамадзян. У рабоце структур ЖКГ прымаюцца адпаведныя меры па мінімізацыі фармалізму. Каб пазбегнуць валакіты пры рэагаванні на заявы спажыўцоў, устаноўлены жорсткі кантроль за тэрмінам выканання заяў і прэтэнзій жыхароў, вызначана персанальная адказнасць кіраўнікоў і органаў выканаўчай улады за парушэнне заканадаўства ў сферы ЖКГ.

У доўгатэрміновых планах развіцця — прывязаць да сістэмы інфармацыю кадастра сетак і жыллёвага фонду, каб пры аварыі вызначаць пералік патэнцыяльных грамадзян, якіх можа закрануць гэтае здарэнне, і накіроўваць ім адпаведныя паведамленні. Разглядаюцца таксама тэхналогіі штучнага інтэлекту і праграмныя прадукты на іх базе для стварэння рабатызаванага дыспетчара на тэлефонную лінію.

Умовы і выгоды раздзельнага збору смецця

— Дзяржава і міністэрства зацікаўленыя ў зніжэнні аб'ёмаў утварэння ў краіне цвёрдых камунальных адходаў і павелічэнні вымання з іх складу карысных фракцый. Ці будуць прапанаваны нейкія стымулы для раздзельнага збору смецця? Напрыклад, дазволіць жыхарам аплачваць частку камунальных паслуг не грашыма, а другаснай сыравінай: макулатурай і шклатарай, як гэта практыкуецца ў Чачэрскім раёне. Наколькі рэальна і ці неабходна рэалізоўваць падобны вопыт у Мінску і іншых абласцях Беларусі? Пры станоўчым рашэнні, ці будзе лімітавацца аб'ём сумы аплаты «камуналкі» праз другасныя рэсурсы?

— Дзяржаўная палітыка ў сферы абыходжання з адходамі грунтуецца на прынцыпе, што выкарыстанне адходаў знаходзіцца ў прыярытэце перад іх захаваннем на звалках. У Беларусі створаны ўмовы і інфраструктура для збору, вывазу і размяшчэння камунальных адходаў, якія забяспечваюць высокі ўзровень санітарнага стану населеных пунктаў. Другасныя матэрыяльныя рэсурсы (ДМР), якія ў нас вымаюцца з адходаў, накіроўваюцца на перапрацоўку, вяртаюцца ў якасці сыравіны ў эканоміку краіны. Гэта дазваляе пастаянна скарачаць долю адходаў, якія захоўваюцца на смеццевых палігонах.

Патэнцыял галіны другаснай перапрацоўкі вялікі і, галоўнае, у нас ёсць дакладнае разуменне на дзяржаўным узроўні, куды і як рухацца. Ёсць профільнае заканадаўства, Нацыянальная стратэгія і дзяржпраграма. З 2012-га ўведзена пашыраная адказнасць вытворцаў і імпарцёраў, згодна з якой яны павінны несці адказнасць за абыходжанне з адходамі, якія ствараюцца пасля таго, як выраблены і ўвезеныя тавары скончаць сваю службу.

Пра вынікі работы можна меркаваць па лічбах. З 2012 года аб'ёмы збору ДМР павялічыліся ўдвая. У 2021-м было сабрана 790,6 тысячы тон другаснай сыравіны, а ўзровень выкарыстання камунальных адходаў склаў 31,1 %, што ўтрая больш, чым дзевяць гадоў таму. Плануецца дасягнуць 64 % выкарыстання камунальных адходаў да 2025-га, і 90 % — да 2035-га.

Нацыянальнай стратэгіяй па абыходжанні з ЦКА і ДМР у Беларусі на перыяд да 2035 года пастаўлена задача ўдасканаліць сістэму, павялічыць узровень перапрацоўкі і выкарыстання адходаў. Мэтавыя паказчыкі і мерапрыемствы ў дадзенай сферы вызначаны ў Дзяржпраграме «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» на 2021—2025 гг. (падпрограма 6 «Мэта 99»).

Што датычыцца другой часткі вашага пытання адносна стымулаў для людзей, то гэта сапраўды важны аспект. Мы лічым, што паспяхова заахвоціць чалавека раздзельным зборам адходаў можна, выканаўшы тры ўмовы. Па-першае, неабходна стварыць жыхарам інфраструктуру (гэта і кантэйнеры, і своечасовы вываз смецця, і зручны графік работы прыёмных пунктаў другаснай сыравіны). Па-другое, важна, каб жыхары былі забяспечаны поўнай інфармацыяй: як правільна збіраць і сартаваць адходы (такая работа вядзецца ў межах доўгатэрміновай рэспубліканскай праграмы «Мэта 99»). Па-трэцяе, асабістая матывацыя кожнага. Безумоўна, яна адрозніваецца. Хтосьці сартуе адходы дома, таму што яму важна жыць у чыстым наваколлі, берагчы нашу ўнікальную прыроду і рэсурсы. Камусьці важны матэрыяльны момант — здаваць другасныя рэсурсы за грошы на прыёмна-нарыхтоўчыя пункты. Згаданы вамі вопыт Чачэрскага раёна ў выпадку ініцыятывы на месцах таксама можа атрымаць развіццё ў краіне.

— Ці з'явіцца ў нашай краіне гарболагі і як гэта скажацца на сістэме збору смецця?

— Калі разглядаць гарбалогію як асобны кірунак экалогіі, які вывучае адходы, іх уздзеянне на наваколле, найбольш бяспечныя спосабы ўтылізацыі і перапрацоўкі, то, безумоўна, гэта важная і запатрабаваная сфера. Мы бачым, што сёння высокая патрэба ў спецыялістах, якія маглі б працаваць непасрэдна з прадпрыемствамі, насельніцтвам, таварыствамі ўласнікаў, садовымі таварыствамі ў якасці кансультанта, дапамагаючы будаваць найбольш эканамічна выгадныя і экалагічна бяспечныя схемы абыходжання са смеццем. Сістэмны аналіз галіны, навуковыя даследаванні ў галіне абыходжання з адходамі ажыццяўляе Інстытут жыллёва-камунальнай гаспадаркі НАН Беларусі.

Пераразлік за паслугі і недаплаты

— Што рабіць, каб пазбавіцца ад «хвастоў» доўгу і пені за камунальныя паслугі, калі чалавек іх ужо аплаціў? Сумы ў некалькі капеек пераходзяць з жыроўкі ў жыроўку месяцамі, а жыхары могуць нават не заўважаць гэтага. Куды ў выніку ідуць гэтыя сумы?

— Найперш хачу нагадаць: каб не ўзнікала так званых хвастоў, у кожнага з нас ёсць абавязак да 25 числа аплаціць спажытыя ў мінулым месяцы паслугі. Разам з тым, калі грамадзяне раней несвоечасова або не ў поўным аб'ёме аплачвалі паслугі, то можа ўзнікнуць сітуацыя, пры якой сума «да аплаты» будзе роўная суме «налічэнняў», аднак пры гэтым у паведамленні таксама адлюстроўваецца сума пені і сума «пераплаты», роўная такой пені. Прыведзеная сітуацыя звязаная з пэўнымі тэхналагічнымі алгарытмамі праграмы, якія рэалізоўваюцца пры налічэнні, напрыклад, пераразлікаў, што прыводзяць да пераплат па некаторых паслугах. Цяпер вядзецца актыўная распрацоўка так званай сістэмы ўліку пераплат, укараненне якой дазволіць у далейшым пазбегнуць абазначаныя выпадкі. У той жа час заўжды можна звярнуцца па тлумачэнні аб прычынах узнікнення ў жыроўках сум пені ў разліковую арганізацыю, дзе налічваюцца сумы за паслугі.

— Ці будзе і надалей працаваць сістэма перазліку аплаты за камунальныя паслугі, калі тэмпература вады ў батарэі ці градус у кватэры не адпавядаюць вызначаным законам параметрам або якасць вады нізкая? Як жыхару даказаць, што ён недатрымлівае цяпло ці якасць, бо многія моманты можна растлумачыць рамонтнымі работамі на камунікацыях або тым, што будынак мае патрэбу ў капрамонце?

— Безумоўна, абарона правоў спажыўцоў жыллёва-камунальных паслуг у выпадку іх неаказання, за выключэннем некаторых плановых перарываў, або аказання паслуг з недахопамі — адзін з асноўных прыярытэтаў, якія паўстаюць перад ЖКГ.

Галоўнае, што трэба памятаць жыхарам, — калі кампаслугі не аказаны без аб'ектыўных прычын ці аказаны неналежным чынам (напрыклад, тэмпература паветра ў пакоях ніжэйшая за 18 °С), неабходна неадкладна паведаміць пра гэта ў любой зручнай форме: пісьмова, па электроннай пошце ці вусна па тэлефоне пастаўшчыку паслугі альбо ў аварыйна-дыспетчарскую службу. Менавіта для такіх мэт, дарэчы, найперш і стварылася служба «115». У далейшым, калі будзе пацверджаны факт няякаснага аказання пэўнай паслугі, то-бок складзены адпаведны прэтэнзійны акт, спажыўцу зробяць пераразлік платы за камунальную паслугу або бязвыплатна прыбяруць указаныя недахопы, калі гэта магчыма тэхнічна. Калі ж выканаўца паслугі даў матываваную адмову ў задавальненні прэтэнзіі, спажывец мае права звярнуцца па незалежную праверку (экспертызу) сваіх патрабаванняў ці ў суд для адпаведнага разбору.

Ірына СІДАРОК.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Скажыце, доктар...

Высокая тэмпература: без панікі

Ці варта яе збіваць і калі піць гарачкапаніжальныя?

Многія рэспіраторныя захворванні, у тым ліку каранавірусная інфекцыя і грып, суправаджаюцца павышэннем тэмпературы цела. Але ці ведаем мы, у якіх выпадках трэба яе збіваць і як правільна гэта рабіць? Урачы прапануюць розныя тактыкі, аднак ёсць і агульныя правілы, якія трэба ведаць кожнаму. Іх мы згадалі разам з нейрахірургам, навуковым супрацоўнікам аддзялення пухлін галаўнога мозгу РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчыкам кафедры неўралогіі і нейрахірургіі БелМАПА Гуменам ГАРБАНІДЖАДАМ.

— Доктар Гумен, давайце спачатку разбяромся, чаму павышаецца тэмпература.

— Усе жывыя істоты дзеляцца на халаднакроўных і цеплакроўных. Цеплакроўныя адрозніваюцца ад халаднакроўных тым, што іх тэмпература цела не моцна залежыць ад навакольнага асяроддзя. Рыба зімой плавае ў ледзяной вадзе і добра сябе адчувае. А вось чалавек нізкіх тэмператур не пераносіць.

Калі вадкасць у арганізме замярзае, крышталі лёду, як нож, ірвуць сценкі клетак. Усе гаспадыні добра ведаюць, што свежае мяса больш пругкае, а калі яго замарозіць, то пасля размарожвання яно становіцца мяккім і губляе форму.

На ртутным тэрмометры мы бачым значэнні ад 34 да 41 градуса. Ніжэй гэтага ўзроўню клетка перастае выпрацоўваць АТФ (натрыю адэназінтрыфасфат), гэта крыніца энергіі, і без яе клеткі працаваць не могуць. Калі тэмпература вышэйшая за 41 градус, бялок згортваецца, адбываецца так званая дэнатурацыя. Гэта тое самае, што і пры адварванні яйка. Ёсць і сярод людзей маржы, якія могуць плаваць у ледзяной вадзе, ці людзі, якія доўга сядзяць у парылцы пры тэмпературы ледзь не 100 градусаў, але гэта выключэнні.

Чаму наш арганізм павышае тэмпературу, калі хварэе? Бо пры высокай тэмпературы бактэрыі гінуць. Вядома, інтэрвал павышэння абмежаваны ў нашым арганізме. Ён не можа іх моцна замарозіць ці перагрэць, каб знішчаць. Але ў меру сваіх магчымасцяў ён стварае максімальна дыскамфортнае асяроддзе, каб бактэрыі ці вірусы больш марудна развіваліся і размнажаліся. І так нашай імуннай сістэме прасцей змагацца.

— Гэта азначае, што, калі тэмпература паднялася, не варта яе знімаць?

— Наш арганізм не паднімае тэмпературу вышэй пэўных градусаў, бо загінуць не толькі мікробы, — ён знішчыць і сябе. Лічыцца, што калі тэмпература паднялася не вышэй за 38,5 градуса і няма індывідуальнай неперанасімасці лікаманкі, знімаць яе не трэба.

Часам бывае, што пры павышэнні да 38 градусаў пачынаецца тахікардыя, дыскамфорт, галавакружэнне і інш. Тады тэмпературу варта знімаць. Калі ж індывідуальнай неперанасімасці няма, знімаць не трэба, бо яна з'яўляецца індывідуальнай абаронай, якая аблягчае барацьбу з вірусам.

— Чым варта знімаць тэмпературу?

— Па рэкамендацыі вашага доктара. Звычайна гэта парацэтамол, ібупрафен, дыклафенак, нестэроідныя супрацьзапаленчыя, калі няма індывідуальнай неперанасімасці. Ібупрафен пачынае працаваць хутчэй і дзейнічае даўжэй. Але ўсё-такі лепш параіцца з урачом.

Калі тэмпература паднялася да 39 і вышэй і хатнімі сродкамі справіцца не ўдаецца, трэба выклікаць «хуткую».

— А калі тэмпература збіваецца на гадзіну-дзве і зноў расце?

— Калі тэмпература паднімаецца неаднаразова і нашы спробы яе збіць не даюць выніку, варта звяртацца да ўрача. Магчыма, паралельна развіваецца нейкае ўскладненне ці захворванне — запаленне лёгкіх, ныркі, перыкардыт і інш. Тут аспірынам ці парацэтамолам мы не абыдземся, і патрэбны больш сур'ёзныя сродкі.

Пры аперацыі на галаўным мозгу можа назірацца так званае павышэнне тэмпературы цэнтральнага генезу. Гэта азначае, што цэнтр у галаўным мозгу, які рэгулюе тэмпературу цела, пачаў па-іншаму сябе паводзіць.

— Як правіла, тэмпература павышаецца ўвечары. Гэтаму ёсць нейкае тлумачэнне?

— Увечары арганізм больш стомлены, і імунная сістэма пачынае паводзіць сябе па-іншаму, таму звычайна ў хворых тэмпература павышаецца. Але гэта не значыць, што чалавеку стала горш.

— Ці заўсёды павышэнне тэмпературы сведчыць пра тое, што ў арганізме адбываецца штосьці не тое, ідзе нейкі запаленчы працэс?

— Звычайна мы вымяраем тэмпературу ў той момант, калі адчуваем сябе дрэнна. Аднак, калі праніторыць яе ў розны час сутак, можна заўважыць, што яна мяняецца. Тэмпература падымаецца, калі мы спацелі, падняліся па лесвіцы, пасварыліся, а таксама ў сувязі з гарманальнымі зменамі, яна мяняецца ў розныя фазы менструальнага цыкла. Таму неабавязкова ў нас ёсць нейкая інфекцыя.

Дарэчы, чым мацнейшы ў чалавека імунітэт, тым хутчэй падымаецца тэмпература, і арганізм хутчэй пачынае змагацца з інфекцыяй. А калі дэпрэсіўны стан, аслаблены імунітэт, недахоп вітамінаў, хранічная стомленасць, імунітэт можа і не рэагаваць адразу.

— Калі тэмпература не 36,6, а, напрыклад 36,0, гэта нармальна?

— Нармальнай лічыцца тэмпература ад 35 да 37 градусаў. У дзяцей да трох гадоў часта тэмпература можа апускацца да 35 градусаў, і гэта не значыць, што ўсё дрэнна. Калі тэмпературу вымяраць пад пахай — гэта 36,6, калі ў роце — крыху вышэй, у прамой кішцэ — мінус адзін градус ад значэння на градусніку.

Тэмпературу ў 37,1—38 градусаў называюць субфебрыльнай, 38,1 і вышэй лічыцца высокай. Калі тэмпература вышэйшая, чым 38,5, пры гэтым вы адчуваеце затармажанасць, моцны галаўны боль, санлівасць, болі ў жываце, сутаргі і адсутнасць эфекту ад прыёму гарачкапаніжальных, варта выклікаць хуткую дапамогу.

Ёсць такія людзі, у якіх усё жыццё 36,6. А ёсць тыя, у каго ўсё жыццё 36,0, і яны сябе адчуваюць нармальна. Ёсць пэўныя захворванні, напрыклад, сіндром міжземнаморскай ліхаманкі, у такіх людзей тэмпература пастаянна павышана, і гэта для іх норма. Таму варта ведаць свае рабочы ціск і тэмпературу.

— Калі высокая тэмпература і хворы шмат часу спіць, гэта нармальна?

— Падчас сну больш выпрацоўваецца антыцел, і таму, калі дарослы ці дзіця спяць, у гэтым нічога дрэннага няма.

— З павышанай тэмпературай можна выходзіць на вуліцу?

— Лепш знаходзіцца дома. На вуліцы можа быць ветрана, нізкая тэмпература, і лёгка атрымаць пераахаладжэнне, бо чалавек з высокай тэмпературай пацее. Да таго ж рэсурсы арганізма расходуюцца на пераадоленне неспрыяльных фактараў знешняга асяроддзя, замест таго, каб змагацца з інфекцыяй. Як паказвае практыка, такія прагулкі падаўжаюць час хваробы.

— Ці варта дома адзяваць паболей адзенне і захутвацца коўдрай?

— Высокая тэмпература — для арганізма стрэс, і ляжанне пад коўдрай узмацняе яго. Пры высокай тэмпературы на лоб ці на ступні добра пакласці вільготныя анучкі, што дапамагае выпарэнню і, адпаведна, зніжэнню тэмпературы.

Высокая тэмпература азначае, што арганізм змагаецца з інфекцыяй, і гэта нармальна. Паднялася больш чым 38,5 — варта збіваць, але баяцца павышанай тэмпературы не трэба.

— Ці азначае гэта, што, калі моцна баліць горла, галава, адчуваеш сябе вельмі хворым, а тэмпература пры гэтым 37-37,5 і вышэй не паднімаецца, то арганізм недастаткова актыўна супраціўляецца?

— Гэта нармальна і азначае, што арганізм змагаецца з інфекцыяй. Горш, калі арганізм перабольшвае. Напрыклад, на той жа COVID-19 імунная сістэма часам рэагуе настолькі актыўна, што пачынае знішчаць клеткі ўласнага арганізма. Калі імунітэт пачынае працаваць агрэсіўна, што тэмпература паднімацца да 40 градусаў, тут без прафесіянальнай медыцынскай дапамогі не абысціся.

Раней, дарэчы, лічылася, што, калі ўвесь час збіваць тэмпературу, антыцелы да інфекцыі не выпрацоўваюцца, але гэта тэорыя аказалася няслушнай. Антыцелы ўсё роўна выпрацоўваюцца. Але моцна збіваць не трэба. Бо гэта дадатковы механізм абароны, які стварае дыскамфортнае асяроддзе для вірусаў і бактэрый.

— Калі высокая тэмпература ў раёне 38-38,5 градуса трымаецца 3—5 дзён, гэта нармальна?

— Мы ведаем, што грып лечыцца на працягу 5—7 дзён, і калі тры дні чалавек тэмпературыць, нічога дрэннага няма, бо арганізм змагаецца. І таргавацца з ім, каб захворванне прайшло за адзін дзень, не атрымаецца. Ён мусіць прайсці пэўныя этапы хваробы.

Ключавы момант — што пры працяглай высокай тэмпературы павялічваецца выпарэнне вадкасці. Таму патрэбна багатае піццё, каб працавалі ныркі.

— Калі мы кажам, што здаровы чалавек мусіць выпіваць у суткі да 2 літраў вады, то колькі патрэбна пры павышанай тэмпературы?

— З тэмпературай 38—39 градусаў, калі вы хварэеце дома, трэба 50—60 мл вады на 1 кг масы цела, гэта дзесьці паўшклянкі-шклянка цёплай вады ў гадзіну.

Дабрачыннасць

Паліклінікі далучыліся да акцыі «Ад усёй душы»

У рамках рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Ад усёй душы» супрацоўнікі 2-й цэнтральнай раённай паліклінікі Фрунзенскага раёна Мінска і 31-й гарадской паліклінікі наведалі адзінокіх пажылых грамадзян і інвалідаў, якія жывуць на тэрыторыі іх абслугоўвання.

Медработнікі 2-й паліклінікі наведалі 83-гадовую Ангеліну Аляксандраву, павіншаваўшы жанчыну з навагоднімі і калядным святамі. Да медыкаў у паліклініку Ангеліна Яўгенаўна часцей прыходзіць сама, але ў святы была рада бачыць іх у сябе дома, прычым не па прычыне недамагання, а з радаснай нагоды.

— Для людзей старэйшага пакалення вельмі важна адчуваць клопат і ўвагу. Мы, медыцынскія работнікі, як ніхто іншы, разумеем, колькі каштоўным можа быць для любога чалавека, а асабліва ў сталым узросце, разуменне, што ты не адзін, — кажа **старшая медыцынская сястра аддзялення агульнай практыкі 2-й цэнтральнай раённай паліклінікі Фрунзенскага раёна Мінска Алена ЦВІЛЕВІЧ**.

Медыкі пажадалі Ангеліне Яўгенаўне моцнага здароўя, міру і дабрабыту, а таксама ўручылі падарункі.

А супрацоўнікі 31-й паліклінікі сярод іншых пабывалі ў сям'і 19-гадовага Сяргея Строкава. Ён інвалід з дзяцінства, і штодзень шмат гадоў яго даглядае мама — Наталля Міхайлаўна. Працуе ў сям'і толькі тата хлопца, Аляксандр Міхайлавіч. Гасцям у гэтай сям'і таксама заўсёды рады.

Медыцынская сястра агульнай практыкі Таццяна РОГАЧ (у цэнтры) і старшая медыцынская сястра аддзялення агульнай практыкі Алена ЦВІЛЕВІЧ (справа) віншуюць Ангеліну Яўгенаўну АЛЯКСАНДРАВУ.

Па слядах Крыжа Ефрасінні Полацкай: новая версія

Паводле інфармацыі Міністэрства культуры Беларусі, за апошнія два гады ў нашу краіну вернуты 24 арыгінальныя культурныя каштоўнасці і больш за 1,5 тысячы копій. Пакуль сярод іх няма галоўнай духоўнай святыні Беларусі — Крыжа Ефрасінні Полацкай, выкананага Лазарам Богшам у 1161 годзе. Пошукам гэтай рэліквіі спецслужбы, дыпламаты, дэпутаты, гісторыкі і грамадскасць займаюцца ўжо не адзін дзясятак гадоў. Адпрацавана як мінімум дзесяць версій, і вось нядаўна з'явілася новая.

У Маскве беларускі партархіў не чакалі

Івану Юркіну, генералмаёру КДБ у адстаўцы, які ў гэтай тэме з 1970-х гадоў, стала вядома, што ў Нацыянальным архіве ёсць успаміны загадчыка партархіва ЦК КП(б)Б Фёдара Папова, які і эвакуіраваў яго з Магілёва. А вывучыць гэты дакумент ён прапанаваў мне: «Паглядзіце свежым вокам, зважайце на дэталі».

Ну вось, мая даўняя мара папрацаваць у архіве спраўджваецца, і тэма з тых, пра якую раз напішаш і будзеш да яе вяртацца.

У архіве атрымала папкі, дзе ляжалі школьныя сшыткі. Адкрыла першы з іх і адразу шок: план на першай старонцы значна большы, чым колькасці дакументаў, якія мне выдалі.

Фіксую, што гэта менавіта ўспаміны, а не дзённік, кажучы сённяшняй мовай, анлайн.

25 чэрвеня 1941 года архіўныя дакументы былі спакаваныя ў спецыяльныя мяшкі і гатовыя да адпраўкі. У гэты ж дзень Панамарэнка прыбыў у Магілёў, яму і дакладваў загадчык архіва аб гатоўнасці да эвакуацыі.

Аб тым, каб эвакуіравацца аўтатранспартам, і гаворкі не ішло. Вагоны заказвалі праз Оршу, але яна ўжо была ў небяспечным становішчы, таму маршрут пралягаў праз Крычаў і Рослаў. Вагоны нават аплацілі!

Імем Панамарэнкі Фёдар Папоў патрабаваў машыны, каб давезці паперы да станцыі. Грузілі архіў спачатку невядомыя людзі, якія капалі траншэі пад камандаванне невядомага лейтэнанта, потым яшчэ курсанты.

«Партархіў пагружаны ў восем вагонаў, у 9-ы — партархіў Магілёўскага абкама, справы і матэрыялы Мінскага і Беластоцкага абкамаў, некаторых раённых камітэтаў заходніх абласцей БССР і некалькі скрынь воінскіх часцей», — удакладняе Папоў. Быў яшчэ і 10-ы вагон, у які загрузілі справы і матэрыялы НКУС і НКДБ БССР, прывезеныя на машынах з Мінска. Гэты вагон суправаджалі мужчына і жанчына.

З высокай ступенню ўпэўненасці можна меркаваць, што ў скрынях былі музейныя каштоўнасці з пакоя-сейфа, а іх нібыта прыналежнасць да воінскіх часцей — гэта маскіроўка, бо ўсе грузы такой катэгорыі вывозіліся ў эвакуацыю з павышанымі мерамі сакрэтнасці. А ў Магілёве ўсё выдатна супала: партыйныя дакументы і самыя каштоўныя музейныя экспанаты апынуліся ў адным месцы.

Гэты эшалон меў доўгую дарогу, як адзначаў Фёдар Папоў, у невядомасць. У Маскву прыбылі 4 ліпеня, вагоны паставілі да пакгаўза для выгрузкі. Суправаджальныя начавалі ў вагонах.

5 ліпеня раніцай Папоў накіраваўся ў цэнтральны партархіў інстытута Маркса, Энгельса, Леніна пры ЦК ВКП(б), але там сказалі, што эвакуацыя беларускага архіва не ў іх кампетэнцыі. Параілі звярнуцца ў ЦК ВКП(б) да кіраўніка спраў Крупіна. *«Ён ціха паведаміў: вагоны з партархівам ЦК КП(б)Б накіруе ва Уфу. Пра гэта паведаміць Башкірскаму абкаму партыі, каб падрыхтавалі памяшканне для размяшчэння архіва. У горадзе не затрымлівайцеся, ідзіце да сваіх вагонаў і чакайце адпраўлення»*, — успамінаў Папоў.

Увечары 5 ліпеня вагоны рушылі ў бок Уфы. Дабраліся без прыгод. Ва Уфе 10 ліпеня прадстаўнікоў Беларусі сустракалі работнікі Башкірскага абкама партыі. Яны арганізавалі разгрузку вагонаў, у якой удзельнічала 70 чалавек камуністаў і камсамольцаў. Каля кожнага вагона і грузавіка была ахова. Першапачаткова беларускі партархіў размясцілі ў падвале будынка гаркама партыі. Натуральна, усе дзверы былі апламбаваны і выстаўлена ахова. Раніцай 14 ліпеня выявілі, што падлога ў сховішчы падтоплена грунтавой вадой. Хутка знайшлі новае месца — першы паверх базы Башкіргандлю на вуліцы Кірава. На гэты раз пагрузачна-разгрузачнымі работамі займаліся работнікі апарата гарадскіх і раённых камітэтаў партыі і камсамола.

Фёдар Папоў піша, што на працягу двух месяцаў здолелі навесці парадак, які дазваляў працаваць з архівам у практычных мэтах.

На жаль, Фёдар Восіпавіч не паспеў дапісаць мемуары. Пачаў ён гэтую працу ў 1969 годзе, а праз год памёр ва ўзросце 63 гадоў. Успаміны, напісаныя рукой Папова, абрываюцца ў 4-м раздзеле, які называецца «Ва Уфе». Далей ён планаваў раздзелы: «Рээвакуацыя», «Шлях дадому», «Вяртанне ў Магілёў», «Аднаўленне партархіва», «Падрыхтоўка да пераводу ў Мінск».

Апошняя старонка ў сшытку напісана іншым почыркам: *«Архіў быў вернуты ў Магілёў восенню 1944 года. Знаходзіўся ў будынку, дзе зараз размешчаны лялечны тэатр. У пачатку 50-х гадоў паўстала пытанне аб пераводзе архіва ў Мінск.*

archives.gov.by

Фёдар Папоў.

Бацька адмовіўся пераязджаць з сям'ёй у Мінск. Новы прызначаны дырэктар Пачанін займаўся перавозкай архіва ў Мінск. А бацька з 1954 года стаў рэктарам педінстытута, меў званне дацэнта і кандыдата гістарычных навук».

Прафесійны архівіст, вопытны партыйны апаратчык, які піша ўспаміны больш за 20 гадоў пасля падзей, не забывае загадкавыя скрыні. Значыць, у наступных раздзелах ён бы абавязкова распавёў, што з гэтымі скрынямі адбылося, бо ў Магілёў яны не вярнуліся.

Па знешнім выглядзе рукапіса можна зрабіць высноў аб тым, што Фёдар Папоў планаваў выдаць мемуары.



Адноўлены Крыж Ефрасінні Полацкай (майстар Мікалай Кузьміч).

bestbelarus.by

Святы Крыж ці залаты фонд?

Такім чынам, дакладна вядома, што партархіў і загадкавыя скрыні прыбылі ва Уфу, нідзе па дарозе нічога з вагонаў не выгружалася, ніякіх нападаў не зафіксавана — пломбы на вагонах правяраліся рэгулярна. Верагодна, ў 1943 годзе скрыні адчынілі. Пра гэта сведчыць той факт, што, пачынаючы з 1943 года, Панцеляймон Панамарэнка не раз згадваў Крыж Ефрасінні Полацкай як выдатны ўзор беларускага мастацтва.

У «Магілёўскі збор» трапілі зусім розныя экспанаты. Відавочна, іх падзялілі мінімум на тры катэгорыі: мастацкія каштоўнасці, у асноўным гэта карціны; прадметы культу — іконы, Слуцкае Евангелле (адзіны экспанат, які «цудоўным чынам» вярнуўся з небыцця) і вырабы з каштоўных металаў, у прыватнасці, золата з раскопак Пампеі, залаты і сярэбраны ключ ад Магілёва, сярэбраная булава караля і вялікага князя літоўскага Жыгімонта Вазы, сярэбраныя пячаткі, атрыманыя Магілёвам разам з Магдэбургскім правам. Пытанне: у якую з катэгорый трапіў Крыж Ефрасінні Полацкай? Па сваім прызначэнні ён — прадмет культу, а вось па змесце — упрыгожаны пласцінамі з золата і срэбра, каштоўнымі камянямі, маглі аднесці да вырабаў з каштоўных металаў. У такім выпадку ўвесь залаты запас мог быць перададзены ў Дзяржхран. А магчыма, быў адпраўлены ў мясцовае банкаўскае сховішча, каб не рызыкаваць з перавозкай дарагога грузу, яго пакінулі ва Уфе, так бы мовіць, да запатрабавання. Магчыма, ён там і сёння, дагэтуль нікім не запатрабаваны. Прынамсі, праверыць гэтую версію не будзе лішнім. Занадта шмат людзей ва Уфе так ці інакш мелі дачыненне да партархіва: пачынаючы ад пагрузачна-разгрузачных работ і завяршаючы тым, што сем'і Папова, Раймса і Галавача жылі ў сем'ях работнікаў Башкірскага абкама кампартыі. Не можа быць, каб там не захавалася ніякіх слядоў.

Зрэшты, некаторыя пошукі можна прадоўжыць і ў Беларусі.

Што хаваў Іван Мігулін?

З 1934 да 1969 года Іван Сяргеевіч Мігулін быў дырэктарам музея ў Магілёве. Постаць вельмі загадкавая, і хто цікавіцца таямніцай Крыжа Ефрасінні Полацкай, нямала ведае пра яго. Некаторыя яго тлумачэнні толькі заблытвалі сляды. Але трэба яшчэ рабіць і папраўку на час.

Вярнуўшыся ў горад пасля эвакуацыі ў 1944 годзе, Іван Мігулін сумесна з членамі камісіі склаў «Спіс разрабаваных нямецкімі акупантамі культурна-гістарычных каштоўнасцяў, якія захоўваліся ў Магілёўскім дзяржаўным гістарычным музеі да Вялікай Айчыннай вайны 1941 — 1944 гг.», у якім 89 пазіцый. Праз тры гады Мігулін склаў новы спіс, у якім было ўсяго толькі 24 пазіцыі, праўда, некаторыя экспанаты ў ім аб'ядноўваліся пад адным нумарам.

Цікава, што 19 кастрычніка 1944 года Панцеляймон Панамарэнка завізаваў свой тэкст для амерыканскай прэсы. У ім ён пералічвае шкоду, прычыненую нямецка-фашысцкімі акупантамі Беларусі. Сярод іншага падрабязна спыняецца на стратах у галіне навукі, адукацыі і культуры. У прыватнасці, піша, што «раскралі і знішчылі найкаштоўнейшыя экспанаты Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР», але не згадвае пра «Магілёўскі збор», у якім таксама былі палотны высокай мастацкай каштоўнасці, не кажучы ўжо пра Крыж і золата Пампей.

Выказвалася меркаванне, што розніца ў спісах за 1944 і 1947 год тлумачыцца тым, што частку каштоўнасцяў з Магілёва выкарыстоўвалі для разлікаў па ленд-лізе. *«Але, наколькі вядома, СССР так і не разлічыўся са сваімі саюзнікамі за аказаную дапамогу падчас вайны. Нават калі дапусціць, што нейкія «таргі» і былі, то перад продажам яны абавязкова праходзілі б экспертаў. І ўжо такія рэліквіі як крыж Ефрасінні Полацкай і залатыя ўпрыгожанні з раскопак Пампеі, напрыклад, наўрад ці сталі б упрыгожваць заходнія калекцыі. Але калі б усё ж нешта і дасталося з магілёўскага збору заморскім гаспадарам, то такія факты сталі б вядомыя»*, — пішуць аўтары кнігі «Шчыт і меч Айчыны», якая расказвае пра дзейнасць КДБ Беларусі.

Але вернемся да спісаў Мігуліна. Вось што аказалася цікавым. У яго карціна Уладзіміра Баравіцкага называецца «Прыдворная кацярынінская дама». Такой няма ў каталогу работ мастака. Затое ёсць «Кацярына II на шпацыры ў Царскасельскім парку» — партрэт Кацярыны II існуе ў двух варыянтах: на фоне Чэсменскай калоны і на фоне Кагульскага (Румянцаўскага) абеліска. Вядома, што пазіравала мастаку прыдворная камер-фраў Мар'я Савішна Перакусіхіна, апранутая ў сукенку імператрыцы. Мог Мігулін так назваць карціну, калі ведаў гісторыю яе стварэння? Мог. Больш за тое, ён мог свядома замятаць сляды, прычым нават не свае, а мог проста выкарыстаць «рабочыя» назвы карцін. Тым больш, што гаворка не пра адно палатно.

У Мігуліна — «Кацярына Святая», а ў каталогу — «Святая Кацярына. Абраз з Казанскага сабора ў Санкт-Пецярбургу». У Мігуліна — «Марыя», у каталогу мастака — «Дзева Марыя». Усе карціны з падобнымі, але іншымі назвамі захоўваюцца ў расійскіх музеях.

Вядома, пошук карцін у інтэрнэце — дылетанцкі падыход, але, можа, ён натхніць мастацтвазнаўцаў правесці параўнанне афіцыйных назваў работ мастакоў і, так бы мовіць, «рабочых». Тым больш, што экспанаты ўсіх расійскіх музеяў каталагізаваны.

Канешне, добра было б мець даваенны вопіс «Магілёўскага збору». Лічыцца, што дакумент знік. Між тым ёсць даныя, што «Магілёўскі збор» у 1932 годзе ўключылі ў вопіс Антыкварнага фонду СССР. Так што ў нас, магчыма, і няма вопісу, але ў Маскве павінен быць. У Беларусі ж могуць знайсціся нейкія ўрыўкавыя звесткі, якія таксама ўяўляюць цікавасць. Знаходка любога экспаната з «Магілёўскага збору» можа дапамагчы высветліць лёс і нашай галоўнай рэліквіі.

Крыжа ў іх няма

Нясмелыя падазрэнні, што царкоўныя каштоўнасці з «Магілёўскага збору» перадалі Рускай праваслаўнай

царкве ў 1943 годзе, калі раптам кіраўніцтва СССР пачало паважлівы дыялог з вышэйшым духавенствам, выказваліся ў 90-я гады.

Даследаванні аднаго з беларускіх навукоўцаў-гісторыкаў указваюць на тое, што Крыж Ефрасінні знаходзіцца ў Тройца-Сергіевай Лаўры, але не на ўсеагульным аглядзе. Яго заявы не засталіся незаўважанымі. З крыніц, якія заслугоўваюць даверу, вядома, што адзін з экс-высокапастаўленых чыноўнікаў накіраваў запыт кіраўніцтву Маскоўскага патрыярхата. Адказ прыйшоў несуцяшальны: Крыжа Ефрасінні Полацкай у нас няма...

У 2013 годзе мітрапаліт Філарэт афіцыйна заявіў, што знайшлося Слуцкае Евангелле, якое знікла разам з Крыжам. Гісторыя пра тое, што Евангелле невядома якім чынам трапіла да прыхаджанкі, а яна падарыла фаліянт святару за адпяванне сваяка, больш падобная на кінасцэнарый. Але і яна схаваная пад флёрам тайны споведзі.

Пошукі павінны працягвацца

Іван Захаравіч Юркін прыкладаў нямала намаганняў для пошуку беларускай святыні. Ён згадвае і такую гісторыю, расказаную народным пісьменнікам Беларусі Мікалаем Чаргінцом. У 1990-я гады Мікалаю Іванавічу, які быў тады старшынёй камісіі па пытаннях знешняй палітыкі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, падчас нефармальнай гутаркі з прэзідэнтам Расіі Барысам Ельцыным удалося закрануць і тэму пошуку Крыжа. Прэзідэнт Расіі прапанаваў вярнуць святыню беларусам, на што чалавек са світы Барыса Мікалаевіча адказаў: «У нас яго няма».

У свой час мітрапаліт Філарэт адзначаў: «Крыж у гісторыі быў сімвалам беларускай святасці і дзяржаўнасці, таму што ствараўся ён як прылада аб'яднання славянскіх плямёнаў... Гэты крыж павінен быў, па ідэі прападобнай Ефрасінні, аб'яднаць варагуючыя, часам роднасныя плямёны. Так што гэта — сімвал перамогі дабра над злом, сімвал адзінства, бо перамога дабра над злом ёсць вынік адзінства сіл дабра».

Вось таму, дзе б ні знаходзілася нашая святыня, усім разам: спецслужбам, дыпламатам, дэпутатам, гісторыкам і грамадскасці — трэба яе шукаць. Сёння яна патрэбная нам, бадай, як ніколі.

Ксенія КАВАЛЕЎСКАЯ.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
18 студзеня 2023 г. № 2 (688)
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

З УВАГАЙ ДА КОЖНАГА

З якімі пытаннямі мінчане і жыхары іншых рэгіёнаў звярталіся да Наталлі КАЧАНАВАЙ

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Калі Савет Рэспублікі чарговы раз аб'яўляе Адзіны дзень прыёму грамадзян — а бывае гэта рэгулярна, прычым у розных рэгіёнах краіны, — ахвотных трапіць на сустрэчу з сенатарам, а тым больш са старшынёй верхняй палаты парламента заўжды шмат (аб тым, як члены Савета Рэспублікі працавалі са зваротамі ў сталіцы — практычна ўвесь наш сённяшні выпуск). Людзі давяраюць заканадаўцам, якія і словам, і справай кожны раз паказваюць, што любое пытанне, за рэдкім выключэннем, паддаецца вырашэнню, што нават у самай складанай сітуацыі ёсць выйсце. Часта грамадзянам дастаткова падказаць, у якім кірунку рухацца. Некаторыя ж пытанні, з якімі людзі ідуць на такія прыёмы, патрабуюць канкрэтных рашэнняў адказных асоб на месцах. У большасці выпадкаў менавіта ад бяздзеяння некаторых чыноўнікаў, ад іх нежадання ўнікаць у абывацельскія праблемы грамадзяне вымушаны звяртацца вышэй — у той жа Савет Рэспублікі, дзе іх уважліва выслухаюць і дакладна дапамогуць.

У гэтым карэспандэнт «Звязды» пераканалася, пабываўшы на прыёме грамадзян, які ў адміністрацыі Першамайскага раёна Мінска праводзіла Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава.

Адразу хочацца адзначыць — весці падобны прыём няпроста. Людзі прыходзяць розныя: адны вельмі эмацыянальныя, з іншых жа слова лішняга не выцягнеш. Некаторыя з заяўнікоў адстойваюць інтарэсы групы людзей (жыхароў дома, калектыву, пэўнай катэгорыі насельніцтва), іншыя распавядаюць аб праблеме канкрэтнага чалавека. Пытанні, на вырашэнне якіх спадзяюцца грамадзяне, ахопліваюць самыя розныя сферы: традыцыйна гэта жыллёва-камунальная гаспадарка, будаўніцтва, транспартнае забеспячэнне, ахова здароўя.

ДАРАГІЯ «КВАДРАТЫ»

Шматдзетныя маці, якія прыйшлі на прыём да Наталлі Качанавай, узнялі пытанне кошту квадратнага метра для шматдзетных сем'яў. Жанчыны, дзве з якіх выхоўваюць па трое дзяцей, падзяліліся, што дагэтуль не маюць уласнай жылплошчы, хоць стаяць у чарзе не адзін год. Мінгарвыканкам неаднаразова прапаноўваў ім кватэры, але іх кошт нават з дзяржаўнай падтрымкай для гэтых сем'яў непад'ёмны. У прыватнасці, кватэры ім прапаноўваліся ў Серабранцы, дзе цана квадратнага метра — 2100 беларускіх рублёў, і на вуліцы Шаранговіча (цана 2200—2300 — за квадратны метр). На Кнорына цана ўвогуле даходзіць да 2630 рублёў за «квадрат».

Як удакладнілі жанчыны, гэта не проста праблема канкрэтных сем'яў. Пытанне, па іх меркаванні, патрабуе комплекснага вырашэння. Заяўніцы не адзіныя са шматдзетных, хто вымушаны адмаўляцца ад будаўніцтва жылля з-за высокай цаны на квадратны метр.

(Заканчэнне на 8-й стар.)

Увага — на работу прадпрыемстваў

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА сустрэлася са старшынямі гарадскіх і раённых Саветаў дэпутатаў, прадстаўнікамі выканаўчых камітэтаў Мінскай вобласці. Такія сустрэчы праводзяцца ва ўсіх абласцях краіны, падчас іх Старшыня Савета Рэспублікі даводзіць да адказных за развіццё рэгіёна асноўныя задачы, пастаўленыя Прэзідэнтам. Сярод галоўных тэм — эканоміка і работа з людзьмі на месцах.

— Падводзячы вынікі 2022 года, вы бачыце, што эканоміка нашай краіны, нягледзячы на беспрэцэдэнтны санкцыйны ціск, працуе нармальна: функцыянуюць прадпрыемствы і арганізацыі, выплачваецца заработная плата, сацыяльныя праграмы і праекты, якія дзейнічаюць у нашай сацыяльна арыентаванай краіне, выконваюцца ў поўным аб'ёме, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Больш за тое, летась мы тройчы павялічвалі пенсію, таксама паднялася зарплата. На 2023 год Прэзідэнтам пастаўлена адназначная задача па павышэнні даходаў работнікаў бюджэтных арганізацый.

Наталля Качанава падкрэсліла, што ў 2022 годзе краіна прадэманстравала станоўчае сальда, экспарт тавараў павялічыўся:

— Увогуле, тыя нішы, якія засталіся свабоднымі, мы паспрабавалі заняць. Усё асноўнае, што павінна працаваць, у нас функцыянуе дастаткова эфектыўна. Усе гэтыя пытанні знаходзяцца на кантролі кіраўніка краіны. Работа прадпрыемстваў — гэта эканоміка, фундамент усяго. Таму перш за ўсё мы павінны скіроўваць нашу ўвагу на прадпрыемствы, арганізацыі і ўстановы: людзі павінны атрымліваць зарплату, мець работу, — адзначыла Наталля Качанава.

Таксама падчас сустрэчы з актывам Мінскай вобласці Старшыня Савета Рэспублікі павіншавала ўсіх прысутных з 85-годдзем заснавання Мінскай вобласці. Наталля Качанава ўручыла прывітальны адрас, а таксама пажадала дабрабыту, поспехаў у рабоце і новых дасягненняў у развіцці рэгіёна.

Адпрацаваць дакладна і зладжана

У Савеце Рэспублікі пад кіраўніцтвам яго старшыні адбылося пасяджэнне арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні X Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Сёлета X юбілейны Форум рэгіёнаў адбудзецца ва Уфе з 26 да 28 чэрвеня.

— Для таго, каб мерапрыемства прайшло зладжана і эфектыўна, да работы былі падключаны ўсе міністэрствы і ведамствы і, вядома, нашы рэгіёны. Расійская Федэрацыя для нас — стратэгічны партнёр, таму ў нашым супрацоўніцтве вельмі важная сумесная работа рэгіёнаў: падпісанне дагавораў паміж гарадамі-пабратымамі, прадпрыемствамі і арганізацыямі, — адзначыла Наталля Качанава.

Яна падкрэсліла, што юбілейны Форум рэгіёнаў павінен прайсці на годным узроўні:

— Мы павінны адпрацаваць дакладна і зладжана, каб не было ніякіх збояў.

Старшыня Савета Рэспублікі скіравала ўвагу ўдзельнікаў на тое, што падчас дакладаў аб выніках работы леташняга Форуму рэгіёнаў Прэзідэнту нашай краіны Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што трэба больш актыўна працаваць па развіцці кааперацыйных сувязяў з расійскімі прадпрыемствамі:

— У сувязі з санкцыйным ціскам вы разумееце, як абсалютна правільна было прынята рашэнне аб правядзенні Форуму рэгіёнаў, таму што і імпартазамяшчэнне, і кааперацыя, і наша сумесная работа з расійскімі калегамі як ніколі актуальныя і выходзяць на новы ўзровень. Таму ад нас патрабуецца зладжаная і дакладная работа, — адзначыла Наталля Качанава.

Аб чым яшчэ гаварылі на пасяджэнні аргкамітэта — чытайце ў наступным нумары «Мясцовага самакіравання».

Арына КАРПОВІЧ.

З УВАГАЙ ДА КОЖНАГА

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

Фота Вікторыі ІВАНЧЫКАВА.

Наталля Качанава пагадзілася, што гэта нятанна, нават калі большую частку ад кошту жылля фінансуе дзяржава.

— Колькі ў вас дзяцей? — удакладніла яна ў адной з заяўніц.

— Трое. У чарзе на жыллё стаю чатыры гады, — адказала Настасся Каркіяйнен.

Спікер верхняй палаты парламента пацікавілася, дзе цяпер жывуць сем'і. Высветлілася, што адны дзеляць жылплошчу з пажылымі бацькамі, іншыя на працягу 10 гадоў жывуць у інтэрнаце. Шматдзетныя маці паведамілі, што ім прапаноўваюць кватэры і меншай плошчы, але яны не пагаджаюцца.

— Але ж гэта не вырашае пытання! — заўважыла Наталля Качанава. — Навошта шматдзетнай сям'і прапаноўваць аднапакаёвую кватэру, калі яна ўсё роўна будзе мець патрэбу ў жыллі?

Спікер верхняй палаты парламента ўдакладніла ў старшыні Мінгарвыканкама, што прысутнічаў на прыёме, чаму мы будуем такія дарагія дамы для тых, хто мае патрэбу ў жыллі, для шматдзетных сем'яў. «Няўжо нельга зрабіць праект больш танным?» — пацікавілася яна. У сувязі з гэтым Наталля Качанава дала даручэнне разабрацца па кожнай шматдзетнай сям'і, якая мае патрэбу ў жыллі, і знайсці прымальныя варыянты ў забеспячэнні іх жыллоплошчай. І ў якасці адной з мер падтрымкі дадзенай катэгорыі насельніцтва Старшыня Савета Рэспублікі прапанавала разгледзець пытанне аб выдзяленні арэнднага жылля для шматдзетных сем'яў.

Уладзімір Кухараў заўважыў, што арэнднае жыллё не карыстаецца ў шматдзетных сем'яў попытам. Заяўніцы пацвердзілі: ім таксама прапаноўвалі арэндныя кватэры, аднак, як і многія, яны хочуць мець уласнае жыллё.

— Дзе б я ні была ў краіне, паўсюль людзі прыходзяць да мяне з падобнымі пытаннямі, — рэзюмавала Наталля Качанава і паабяцала абмеркаваць з паўнамоцнымі асобамі ўсе варыянты, якія ўрэгулююць цану на квадратны метр для шматдзетных сем'яў.

НЕЗАВЕРШАНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Калектыўны зварот жыхароў дома па Харкаўскай, 58 у Мінску на прыёме агучыла старшыня таварыства ўласнікаў Вольга Еўсікава. Грамадзянка расказала, што жылы дом ужо на працягу некалькі гадоў уведзены ў эксплуатацыю, але паркінг дагэтуль недабудаваны. Незавершаным аб'ект з'яўляецца ўжо больш як 10 гадоў! Па яе словах, таварыства здольнае само завяршыць будаўніцтва, але Мінгарвыканкам не дае на гэта дазвол. Больш за тое, як яна расказала, мясцовая ўлада збіраецца паркінг знесці — а, між іншым, у свой час дольшчыкі ўносілі за сваё машына-месца вялікія грошы!

— Калі дольшчыкі пабудуюць паркоўку за свой кошт, яны змогуць увесці яе ў эксплуатацыю? — удакладніла ў мэра Мінска Старшыня Савета Рэспублікі. — Вы ім не будзеце перашкаджаць?

Уладзімір Кухараў пацвердзіў, што з боку Мінгарвыканкама ніякіх перашкод быць не павінна, пры ўмове поўнага разумення тэрміну будаўніцтва і крыніцы фінансавання.

— Калі вы гатовыя знайсці інвестара і дабудоўваць — знаходзьце інвестара і дабудоўвайце, — адказала спікер старшыні таварыства ўласнікаў. — Аднак вы павінны даць гарантыі таго, што ў вас ёсць фінансаванне і ў якія тэрміны вы завершыце будаўнічыя работы. Калі з'явяцца невырашальныя пытанні, звяртайцеся ў прыёмную Савета Рэспублікі.

На незавершанае будаўніцтва падземных аўтастаянак па вуліцы Парнікавай паскардзіўся і Мікалай Савіцкі. Ён расказаў, што на працягу 25 гадоў дзве падземныя станкі застаюцца недабудаванымі. Заказчыкам будаўніцтва ў свой час выступіў завод імя Вавілава, будаўніцтва вяла фірма, якая абанкруцілася.

— Больш за тое, аб'ект прынялі ў эксплуатацыю недабудаваным, — паведаміў дэталі заяўнік. — Аднак ва ўласнасць аб'ект жыхарам не перадалі, бо фактычна ён быў недабудаваны. У выніку каператыў прыцягнулі да адказнасці за самавольнае заняцце зямлі.

Жыхары падалі ў суд за адмену згаданага рашэння. Суд адмяніў рашэнне Мінгарвыканкама 2018 года. Новае рашэнне суда прызнае жыхароў карыстальнікамі аб'екта нерухомасці, але не зямельнага ўчастка. Ёсць і яшчэ адна праблема, якая хвалюе людзей, — канструкцыя аўтастаянкі знаходзіцца пад пагрозай разбурэння. А да гэтага, па іх словах, нікому няма справы.

Старшыня Адміністрацыі Першамайскага раёна Дзмітрый Шашок у курсе сітуацыі. Ён заўважыў, што ўсе боксы знаходзяцца ва ўласнасці грамадзян, фізічных асоб. «Уласнікі прасілі фінансавай дапамогі ў Мінская механічнага завода імя С. І. Вавілава — кіруючай кампаніі холдынга «БелОМА», які з'яўляецца прадпрыемнікам завода імя Вавілава, для таго каб ліквідаваць усе дэфекты з мэтай далейшай эксплуатацыі гаражных боксаў, — далажыў старшыня Адміністрацыі. — Пазіцыя завода катэгарычная: у фінансаванні было адмоўлена».

«Мы не прасілі фінансавай дапамогі, мы прасілі здаць аб'ект завершаным», — удакладніў Мікалай Савіцкі.

Дзмітрый Шашок дадаў, што ўсе службы разбіраюцца па прыведзеным пытанні, аднак дагэтуль рашэнне не знойдзена. «Патрэбна разабрацца да канца, — паставіла задачу Наталля Качанава. — Які сэнс судзіцца?» У сваю чаргу, Старшыня Савета Рэспублікі паабяцала, што арганізуе Мікалаю Васільевічу сустрэчу з сенатарамі, якія падкажуць заяўніку, як вырашыць пытанне.

КАНФЛІКТ БАКОЎ

Інтарэсы ўласнікаў нежылых памяшканняў аднаго з дамоў шматфункцыянальнага комплексу Minsk World прадставіла Аляксандра Басава. Старшыня таварыства ўласнікаў нежылых памяшканняў расказала пра канфлікт прадпрымальнікаў і жыхароў шматпавярховіка, дайшло нават да суда.

Па словах заяўніцы, жыхары лічаць, што ўласнікі нежылых памяшканняў павінны несці ў тым ліку і выдаткі. Пры гэтым жыхары хочуць мець даход ад нежылой часткі дома. «Кажуць, што мы парушаем іх правы, бо не могуць прымаць рашэнні па нашай частцы жылога дома, — заўважыла Аляксандра Басава. — У нас аўтаномныя сістэмы камунікацый, прыборы ўліку свае, мы плацім па камерцыйных тарыфах, прыборка практычна штодзённая — у нас іншыя мэты і задачы, чым у жыхароў. Жыхары настойваюць, што нежылыя памяшканні з'яўляюцца часткай жылога дома, і жадаюць, каб суд прызнаў ліквідацыю нашага таварыства».

У сваю чаргу, прадстаўнікі таварыства нежылых памяшканняў просяць адміністрацыю раёна ўзяць на сябе адказнасць урэгуляваць канфлікт, каб у выніку было падпісана адпаведнае пагадненне па раздзяленні зоны адказнасці паміж таварыствамі жылых і нежылых памяшканняў. Уладзімір Кухараў, які днямі правёў нараду з прадстаўнікамі таварыства ўласнікаў жылых памяшканняў гэтага дома, добра азнаёмлены з пазіцыяй кожнага з бакоў. Па яго словах, аплата павінна адбывацца прапарцыянальна з двух бакоў. Як адзначыла заяўніца, уласнікі нежылых памяшканняў гатовыя плаціць, але настойваюць на падпісанні адпаведнага пагаднення.

— Вузлы, якія завязваюцца, павінны ўрэгуляваць мясцовыя органы ўлады, гэта ваша кампетэнцыя, — звярнула ўвагу прысутных Наталля Качанава. — А вы завязваеце гэтыя вузлы далей. А што за гэтымі вузламі? Незадавальненне кіраўніком адміністрацыі Першамайскага раёна — а значыць, уладай краіны. Адміністрацыя павінна сабраць два бакі, каб у выніку было падпісана пагадненне.

Старшыня Савета Рэспублікі дала адзін месяц на ўрэгуляванне сітуацыі.

НАСТУПСТВЫ КАПІТАЛЬНАГА РАМОНТУ

Жыхары аднаго з дамоў па вуліцы Чарнышэўскага звярнуліся на прыём да Наталлі Качанавай па пытанні няякаснага капітальнага рамонту, зробленага шэсць гадоў таму. Жанчыны паскардзіліся на праблемы з ацяпленнем.

«Увесь час мы жывём у адным тэмпературным рэжыме: і калі на вуліцы мінус 10, і калі плюс 20, — увяла ў курс справы Таццяна Пугачова. — Я ўсё жыццё пражыла ў гэтым доме, але апошнія шэсць гадоў ацяпляльны сезон для нас пераўтварыўся ў жах. Мы жывём з галаўнымі болямі, бо тэмпература ў кватэрах 25-26 градусаў. Атрымліваецца, што мы абаграваем вуліцу: у мароз нашы вокны адчынены насцеж. Многія з-за гэтага ўжо папрадавалі свае кватэры».

Жыхары гэтага дома неаднойчы звярталіся ў адміністрацыю Першамайскага раёна, але ўвесь час атрымлівалі адпіскі, прычым з такімі фармуліроўкамі, што яшчэ не кожны і разбярэцца.

— Навошта такія незразумелыя адказы? — звярнулася Наталля Качанава да мясцовых чыноўнікаў. — Не ўводзьце людзей у зман! Людзям патрэбна, каб у іх былі створаны камфортныя ўмовы для пражывання. Ужо ва ўсіх дамах, нават у раёнах, пастаўлены рэгулятары, якія кантралююць падачу цяпла. А тут Мінск... Няўжо за шэсць гадоў не маглі разабрацца?

Уладзімір Кухараў паабяцаў, што перад наступным ацяпляльным сезонам усё будзе перароблена. Цяпер спыніць сістэму немагчыма. Заяўніцы падзякавалі і за гэта. Пры гэтым заўважылі, што на прыём да Старшыні Савета Рэспублікі трапіць прасцей, чым да кіраўніка свайго раёна.

— Да мяне прыходзяць людзі і расказваюць, што запісацца на прыём да мясцовай улады немагчыма, і так паўсюль, — звярнула ўвагу Наталля Качанава. — У 115 заяўку прымуць і будуць дзесяць гадоў яе выконваць. Так быць не павінна! Прыёмы павінны весціся.

Звярнуўшыся да заяўніц, спікер паабяцала: «Усё будзе зроблена!» І ў гэтым ніхто з тых, хто прыйшоў да Наталлі Качанавай на прыём, які доўжыўся больш як 12 гадзін, не сумняваецца. Аб гэтым сведчаць сотні вырашаных пытанняў, з якімі людзі раней звярталіся да Старшыні Савета Рэспублікі, пра што мы, дарэчы, пісалі ў папярэднім выпуску «Мясцовага самакіравання».

Вераніка КАНЮТА.

«З ЛЮДЗЬМІ ТРЭБА ПРАЦАВАЦЬ — У ГЭТЫМ НАША СІЛА»

Праводзячы выязное пашыранае пасяджэнне Прэзідыума Савета Рэспублікі, якое адбылося 12 студзеня, Наталля КАЧАНАВА падсумавала вынікі работы са зваротамі грамадзян і юрыдычнымі асобамі ў сталіцы за 2022 год. Старшыня Савета Рэспублікі акцэнтавала ўвагу на неабходнасці ўважлівага разгляду кожнага запыту.

— Часам мы адным сваім няўважлівым стаўленнем да чалавека, нежаданнем з ім пагаварыць, пачуць, перакрэсліваем усё тое, што ствараецца працай і многімі гадамі па крупінках, фарміруючы нашу краіну як міралюбівую, суверэнную, дзе ў прыярытэце — справядлівасць у адносінах да людзей. Выходзячы з гэтых задач, якія ставіць перад намі кіраўнік дзяржавы, мы не маем права паступаць інакш. Мы павінны рабіць усё, каб захаваць мір і спакой, каб наша краіна і надалей развівалася, і не дапусціць ніякіх нават намераў, каб нехта паквапіўся на нашу краіну. Мы павінны быць адзіныя, як маналіт. Сёння супраць нашай краіны вядзецца мэтанакіраваная работа. І мы не павінны падвесці свае старэйшыя пакаленні, тых людзей, якія абаранілі мір і свабоду, якія стваралі нашу краіну. Мы павінны зрабіць усё, што ад нас залежыць. І ад нас гэта залежыць шмат у чым. Таму нельга адштурхоўваць людзей. З людзьмі трэба працаваць, людзям трэба дапамагаць. У гэтым наша сіла.

Наталля Качанава адзначыла, што ў большай ступені мінчан хвалююць пытанні аховы здароўя, ЖКГ і будаўніцтва жылля.

— Амаль 40 % звароташ, якія паступаюць у Савет Рэспублікі, — з Мінска. Падчас адзінага дня прыёму грамадзян у сталіцы не было звароташ, якія датычыліся стварэння бяспекі, работы праваахоўных органаў, — распавяла Наталля Качанава. — А вось што датычыцца жыллёва-камунальнай гаспадаркі, будаўніцтва, незавершанага будаўніцтва, то такіх звароташ даволі шмат. Гэта сведчыць аб тым, што трэба выбудоўваць дакладную сістэму ў рабоце гэтых службаў.

Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла, што дакладная работа таксама павінна быць выбудавана і з людзьмі:

— Акрамя таго, што я Старшыня Савета Рэспублікі, я ўпаўнаважаны прадстаўнік Прэзідэнта па горадзе Мінску. Для мяне вельмі важна, каб была дакладна выбудавана работа з людзьмі, каб людзі не хадзілі ад адной службовай асобы да іншай, спрабуючы вырашыць сваё пытанне, каб ім не трэба было шукаць праўды ў іншых органах улады. І не таму, што мы не жадаем працаваць з людзьмі. Я заўсёды з вялікім задавальненнем працую з людзьмі, бачу, наколькі ў іх сфарміравана стаўленне да ўлады — пазітыўнае ці, наадварот, ёсць нейкія праблемы. Мы для сябе робім высновы, дзе недапрацоўваем, што нам яшчэ трэба зрабіць, каб людзі маглі атрымаць кваліфікаваную кансультацыю.

Наталля Качанава таксама скіравала ўвагу на тое, што выбудаваная ў краіне сістэма сацыяльнай падтрымкі дзейнічае даволі паспяхова: дабрачынныя акцыі становяцца добрай традыцыяй, павялічваецца пенсія і зарплата работнікаў бюджэтных арганізацый.

— У нас ёсць добрыя традыцыі. Іх шмат у нашай суверэннай краіне. Мы іх прытрымліваемся і развіваем. Яны робяцца брэндамі для нашай краіны. Гэта акцыя «Нашы дзеці». Аляксандр Лукашэнка ўнёс прапанову аб правядзенні дабрачыннай акцыі для пажылых «Ад усёй душы». Мы сталі актыўна далучацца і ўбачылі, што, сапраўды, і гэтых людзей трэба падтрымліваць. Хоць мы іх падтрымлівалі заўсёды, але трэба, каб і моладзь прасякнулася гэтым, — дадала Старшыня Савета Рэспублікі. — Наша краіна праводзіць сваю незалежную палітыку, мы вытрымалі і вытрымліваем санкцыйны ціск. Сёння мы не проста не збавілі недзе тэмп, а наадварот. За год тры разы павялічвалася пенсія. Павялічвалася заработная плата работнікам бюджэтных арганізацый. На гэты год павялічана фінансаванне з рэспубліканскага бюджэту на абарону і падтрымку нашых грамадзян па сацыяльных напрамках. Гэта вялізная работа людзей, якія жывуць і працуюць у нашай краіне. І тая сістэма, якая выбудавана, можа служыць прыкладам для многіх краін.

— Гэты год палітычна вельмі важны. Літаральна праз год будзе праходзіць адзіны дзень галасавання. Грамадства ў любы перадвыбарчы год дастаткова актыўна пачынае абмяркоўваць, выносіць пытанні для разгляду і вырашэння. І, разглядаючы гэтыя пытанні, мы павінны дакладна разумець, што можам зрабіць, выходзячы з таго фінансавання, якое прадугледжана на 2023 год, дзесьці і на перспектыву запланаваць вырашэнне пытанняў. Таму што людзі гавораць пра гэта, і такія пытанні трэба вырашаць, — рэзюмавала Старшыня Савета Рэспублікі.

Арына КАРПОВІЧ.

Добрая падказка заканадаўцам

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл РУСЫ праводзіў прыём у адміністрацыі Маскоўскага раёна. Асноўнымі пытаннямі, з якімі грамадзяне звярталіся да парламентарыя, сталі ЖКГ, зямельныя спрэчкі, добраўпарадкаванне тэрыторый і прыватызацыя.

Фота Аляксандры БАЖЭНАВАЙ.

Так, пенсіянерка Валянціна Сяргееўна звярнулася з просьбай дапамагчы ў працягненні кантракта для яе сына, які працуе на заводзе «Палімір» электраманцёрам. Сітуацыя склалася такім чынам, што сыну грамадзянкі даводзілася неаднаразова адпрошвацца з працы, каб трапіць на судовы працэс.

> Падводзячы вынікі прыёму ў адміністрацыі Маскоўскага раёна, Міхаіл Русы адзначыў, што адзін з асноўных напрамкаў у рабоце з грамадзянамі — атрыманне інфармацыі аб тым, як працуе заканадаўства ў той ці іншай сферы.

— Павестка ў суд — гэта афіцыйны дакумент, які з'яўляецца ўважлівай прычынай пры пуску працы, — адзначыў Міхаіл Русы. — Сёння мы дашлём даручэнне кіраўніцтву «Паліміра», каб яны разгледзелі сітуацыю больш дэталёва. Калі чалавек добрасумленна выконваў свае абавязкі, паспрыяем таму, каб ён і далей працаваў электраманцёрам.

Жыхар горада Маладзечна Раман Францэвіч звярнуўся з пытаннем добраўпарадкавання дарожнага пераходу каля чыгункі ў мікрараёне Усходні.

— Вам трэба звярнацца да кіраўніцтва чыгункі, райвыканкам ніякім чынам не вырашыць гэтае пытанне, — адрэагаваў парламентарый. — Мы дашлём вашы дакументы кіраўніку чыгункі Уладзіміру Марозаву, каб ён сумесна са старшынёй Маладзечанскага райвыканкама Юрыем Горлавым разгледзеў сітуацыю на месцы і даў сваё заключэнне. Трэба, каб спецыялісты вырашылі, ці мэтазгодным будзе ўсталяванне пераходу менавіта на тым месцы, вызначыліся з канструкцыяй і распрацавалі праект.

Шматдзетная маці Наталля Мікалаеўна набыла былы адміністрацыйны будынак, які зараз хоча знесці, а на яго месцы плануе пабудаваць жылы дом. Але Чашніцкім райвыканкамам было адмоўлена ў пераводзе мэтавага назначэння ўчастка для пабудовы жылога дома.

— З 1 студзеня ўступіў у сілу адпаведны закон, таму ваша просьба правамерная, — распавёў Міхаіл Русы. — Цяпер мясцовыя органы ўлады маюць паўнамоцтвы і могуць разабрацца з гэтай праблемай.

Сталічны дом, які знаходзіцца на завулку Аўтадараўскі, прызнаны непрыдатным для пражывання. Сам будынак знаходзіцца на балансе Мінскага аддзялення беларускай чыгункі. Жыхары дома звярнуліся да парламентарыя з просьбай дапамагчы ў вырашэнні праблемы. «Пытанне вельмі сур'ёзнае, — распавяла мінчанка Алена Уладзіміраўна. — Яшчэ ў 2007 годзе дом быў прызнаны нежылым і ішоў пад знос. Нам прапаноўвалі будаваць, але жыхары адмовіліся з-за недахопу фінансавых сродкаў».

— Калі пытанне звязана з аварыйнасцю будынка, вам трэба звяртацца ў Беларускую чыгунку, у нас ёсць пастаянна дзеючая камісія, якая правядзе экспертызу. У выніку вам могуць прапанаваць арэндную кватэру і кампенсацыю за ўласнасць, — растлумачыў Міхаіл Русы. — Мы даручым Уладзіміру Марозаву аператыўна правесці абследаванне на прадмет аварыйнасці, і выходзячы з гэтага, будзе прынята рашэнне ў адпаведнасці з законам.

Падводзячы вынікі прыёму ў адміністрацыі Маскоўскага раёна, Міхаіл Русы адзначыў, што адзін з асноўных напрамкаў у рабоце з грамадзянамі — атрыманне інфармацыі аб тым, як працуе заканадаўства ў той ці іншай сферы:

— Кіраўніком дзяржавы было прынята добрае рашэнне па зямлі. Шматдзетная маці набыла аварыйны адміністрацыйны будынак, дзе хацела пабудаваць жыллё. Але да ўнясення змяненняў і дапаўненняў у Кодэкс аб зямлі ў мясцовых органаў улады не было паўнамоцтваў змяніць мэтавае выкарыстанне ўчастка. Дадзены прыклад якраз паказвае, што мы правільна выбралі кірунак работы з заканадаўствам, — распавёў парламентарый. — Таксама да мяне звярнуўся грамадзянін, які быў знаёмы з новым указам Прэзідэнта аб пустых дамах. Але грамадзянін не зразумеў, што проста засяліцца і жыць у пустым доме нельга. У выпадку, калі сельскі Савет праз суд вызначыць, што дом не мае гаспадара, грамадзяне маюць права набыць будынак на аўкцыёне. Добрае рашэнне, пайшлі «падзвіжкі».

Парламентарый адзначыў, што падчас адзінага дня прыёму вызначыў некалькі кірункаў для далейшай работы.

— Гэта распрацоўка змяненняў у архітэктурны і горадабудаўнічы кодэкс, таму што некаторыя моманты трактуюцца дваяка, а таксама ўнясенне дапаўненняў у закон аб ЖКГ. Прыём грамадзян — гэта свайго роду падказка, куды нам рухацца. Вельмі хочацца дапамагчы людзям, даць ім магчымасць працаваць і жыць у камфортных умовах. Але пры гэтым мы павінны выходзіць з таго, што ёсць закон, на які мы абапіраемся. А ў выпадку, калі ў законе ёсць прабелы, іх неабходна карэкціраваць, — рэзюмаваў Міхаіл Русы.

Арына КАРПОВІЧ.

Знос жылля, нявыплачаная зарплата і адабраная кватэра

З такімі і іншымі пытаннямі ў адзіны дзень прыёму людзі звярталіся да Алега РУМО, члена Савета Рэспублікі, які прымаў грамадзян у адміністрацыі Цэнтральнага раёна Мінска. Большасць хвалявалі жыллёвыя праблемы, але прыходзілі і са скаргамі на медыкаў, міліцыю, работадаўцаў.

Алена Сталеўская з 2021 года скардзіцца на моцны шум у батарэі, што не дае ёй спакойна спаць у кватэры дома, якому ўжо 63 гады. А яшчэ — на павышаную гарачыню (у жыллі 27 °С). Калі ж паменшыць градус цепланосьбіта, холадна становіцца ў яе суседзяў.

— Прыязджалі з цэнтра эпідэміялогіі, рабілі замеры шуму, прыходзілі камісіі з ЖКГ — і нічога, — перажывае жанчына.

— Магчыма, праблема звязана з тым, што дом ужо вельмі даўно эксплуатуецца, таму мы папросім спецыяліста адміністрацыі раёна правесці адпаведныя мерапрыемствы, каб вы маглі спакойна спаць, — паабяцаў асабіста пракантраляваць сітуацыю сенатар.

Дом жанчыны, дарэчы, запланаваны пад знос як аварыйнае жыллё, і яна непакоіцца, дзе жыхарам іх двухпавярховіка будуць выдзелены новыя арэндныя кватэры.

— Каб рэалізаваць вашы маёмасныя правы, вам будзе выдзелена жыллё у Навінках, магчыма, на вуліцах Нававіленская, Выгодскага, Мядзёлкі і г. д. Стараемся даваць жыллё непадалёк ад папярэдняга: усё залежыць ад метражу жылля і колькасці зарэгістраваных у ім грамадзян, — растлумачыў **Вадзім ПЯРЭДНЯ, першы намеснік кіраўніка адміністрацыі Цэнтральнага раёна**.

Людміла Саланько прыйшла скардзіцца, што яе пазбавілі кватэры, якую ёй па завяшчанні пакінуў сужыцель, а таксама аформіў дагавор рэнты. Пасля яго смерці з'явіліся несапраўдныя сваякі з падробленымі дакументамі, і жанчыну ўсяго пазбавілі.

Алег Румо папрасіў пакінуць заяву і паабяцаў асабіста накіраваць скаргу ў адпаведныя судовыя інстанцыі ў сувязі з нанава адкрытымі абставінамі (прыйшлі дакументы па «сваяках», дзе стала відавочна, што «пляменніца» памерлага — зусім не яна, бо ў паперах выпраўлена імя маці — сястры нябожчыка)...

> Для любога чалавека яго праблемы — самыя галоўныя. І невырашэнне яго жыллёвага ці сацыяльнага пытання на лакальным узроўні пэўным чынам накладае негатыўны адбітак на ўсю вертыкаль улады, таму трэба стараццца заўжды дапамагчы чалавеку.

Адна з наведвальніц паскардзілася, што доўгія гады не можа вылечыць крывацёк з носу. Сенатар, высветліўшы, што апошні раз яна звярталася ў бальніцу даўно, проста па тэлефоне назначыў ёй сустрэчу з галоўным урачом 4-й бальніцы, параіўшы завітаць да доктара.

Двое мужчын прыйшлі са скаргай, што працавалі на будоўлі на поўначы Расіі, куды іх з Беларусі накіравала прадпрыемства «Альфагазбуд». Аднак людзі не атрымалі грошы, а некаторым з іх нават не ўдаецца вярнуць працоўную кніжку, так што яны

цяпер «працаўладкаваныя бамжы». І такіх, як яны, шмат.

Высветлілася, што работай кампаніі, ад якой яны выязджалі працаваць, ужо займаюцца адпаведныя органы, таму варта спадзявацца, пытанне вырашыцца на карысць людзей. Праўда, пры гэтым наведвальнікам параілі напісаць калектыўную заяву ў Галоўнае ўпраўленне ўнутраных спраў Мінгарвыканкама, каб адстойваць свае правы і разам выступаць у судзе сведкамі.

Правядзенне адзіных прыёмаў грамадзян важнае не толькі тым, каб дапамагчы канкрэтнаму чалавеку, але і атрымаць зваротную сувязь ад грамадства, ці правільна працуюць парламентарыі, заўважыў Алег Румо:

— Калі людзі хочуць вырашаць свае пытанні праз нас, а не органы мясцовай улады, то, пэўна, яны нам давяраюць. Здараецца, што праблему, з якой прыйшоў чалавек, можна вырашыць на месцы, — для гэтага на прыём і запрашаюцца прадстаўнікі адміністрацыі. Аднак калі трэба пракантраляваць выкананне, правесці праверку на больш высокім узроўні або ўмяшацца органам дзяржулады, мы просім выкласці скаргу на паперы, каб потым накіраваць яе за ўласным подпісам у адпаведную інстанцыю, а пазней атрымаць адтуль адказ, на падставе якога раіць, што рабіць чалавеку далей, або паведаміць яму, што справа вырашана.

Сенатар упэўнены, што для любога чалавека яго праблемы — самыя галоўныя. І невырашэнне яго жыллёвага ці сацыяльнага пытання на лакальным узроўні пэўным чынам накладае негатыўны адбітак на ўсю вертыкаль улады, таму трэба стараццца заўжды дапамагчы чалавеку.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

«ВАЖНА БАЧЫЦЬ УВЕСЬ ЗРЭЗ ЗАПЫТАЎ ЖЫХАРОЎ КРАІНЫ»

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна Рунец праводзіла прыём у адміністрацыі Партызанскага раёна. Пытанні, з якімі звярнуліся да сенатара, датычыліся самых розных сфер: ад якасці капітальнага рамонту дома да вяртання сродкаў прыватным інвестарам пасля ліквідацыі прадпрыемства. Акрамя грамадзян, на прыёме прысутнічалі і прадстаўнікі юрыдычных асоб, на чый адрас гучалі скаргі.

Жыхарка Брэста ўзяла крэдыт у «Белаграпрамбанку» ў 2008 годзе на набыццё кватэры і своечасова аплачвала выстаўленыя плацяжы. Летась, калі яна звярнулася ў банк, каб датэрмінова пагасіць адразу палову доўгу, высветлілася, што ў 2011 годзе адбылася тэхнічная памылка, і з гэтага моманту штомесячны плацеж налічваўся няправільна — у меншым памеры. З таго часу заяўніцы кожны месяц дадаткова налічваюць недаплату. Жанчына скардзілася, што банк не жадае прызнаваць памылку.

> Людзі гавораць пра самае для іх важнае, імкнуцца атрымаць адказ на месцы. Беларусь пазіцыянуе сябе як сацыяльна арыентаваная дзяржава, і, прыходзячы на прыём, людзі бачаць, што яно так і ёсць. Іх пажаданне або праблема пачутыя, узятыя на кантроль, а значыць, будуць вырашаны.

Прадстаўнікі ўстановы адзначылі, што банк недаатрымаў 11 тысяч долараў, і загаданую суму заяўніцы падзялілі роўнымі часткамі да 2028 года — па 90 долараў на месяц замест усёй сумы адразу. Акрамя таго, банк увесь час ішоў насустрач заяўніцы, у прыватнасці, зніжаў крэдытную нагрузку шляхам адтэрміноўкі платы працэнтаў на працягу 10 гадоў.

Таццяна Рунец падкрэсліла, што банк мусіць прызнаць сваю памылку, і папрасіла яго супрацоўнікаў узяць сітуацыю на кантроль і скласці графік плацяжоў па крэдыце.

Шматдзетная мінчанка звярнулася на прыём да сенатара з пытаннем аб датэрміновым выкарыстанні сямейнага капіталу. У 2012 годзе сям'я ўзяла крэдыт на жыллё, а ў 2020-м стала шматдзетнай. Заяўніца хацела б пагасіць крэдыт сямейным капіталам.

Як растлумачыла Таццяна Рунец, законных падстаў для гэтага няма: крэдыт і кватэра былі атрыманы, калі сям'я не была шматдзетнай — у 2012-м. А права на сямейны капітал сям'я атрымала ў 2020 годзе. Гэтыя сродкі даюцца менавіта на трэцяе дзіця, і іх датэрміновае выкарыстанне на пагашэнне старых запазычанасцяў не прадугледжана. Калі б сям'я набывала ці будавала кватэру пасля нараджэння трэцяга дзіцяці, скарыстаць гэтыя сродкі можна было б. Сямейны капітал можна будзе патраціць і пазней, калі дзіцяці споўніцца 18 гадоў — на навучанне ці медыцынскія паслугі.

Яшчэ адзін заяўнік — прадстаўнік кампаніі, якая мае намер інвеставаць сродкі ў рэканструкцыю шматфункцыянальнага будынка па вуліцы Маякоўскага ў Мінску. Для рэалізацыі дадзенага праекта — будаўніцтва мыйкі самаабслугоўвання — да ўчастка, які ўжо маецца ва ўласнасці, трэба далучыць яшчэ 13 «сотак».

Старшыня Камітэта архітэктуры і горада-будаўніцтва Мінгарвыканкама Вольга Верамей, якая прысутнічала на сустрэчы, растлумачыла, што зварот заяўніка будзе разгледжаны ў Мінгарвыканкаме, і паведаміла пра варыянты вырашэння сітуацыі. Таццяна Рунец распарадзілася падысці да пытання з усёй дбайнасцю і ў адпаведнасці з заканадаўствам разгледзець магчымасці ўлічыць інтарэсы кампаніі, якая інвестуе ў развіццё горада.

Пытанне, якое датычыцца многіх жыхароў краіны, узняла ўладальніца дачнага ўчастка, якая прыйшла на прыём. Яе садовае таварыства размешчана пад Лагойскам. Блізкасць ад Мінска і капітальныя камфортныя дамы дазваляюць многім дачнікам пражываць у таварыстве цэлы год. Развітая інфраструктура ў пасёлку ёсць, але ўладальнікаў турбуюць высокія тарыфы на электраэнергію. Жанчына прывяла ў прыклад жыхароў суседняй вёскі, дзе плата за электразабеспячэнне істотна ніжэйшая.

Як адзначыла Таццяна Рунец, у Мінску і ў іншых рэгіёнах краіны жыхары часта звяртаюцца з пытаннямі зніжэння тарыфаў на электраэнергію ў садовых таварыствах.

— Сёння разглядаецца праект адпаведнага ўказа. Мы яшчэ раз звернем увагу Міністэрства энергетыкі на пажаданне членаў садовых таварыстваў, даручым дэталёва разабрацца ў пытанні, — удакладніла яна.

Яшчэ адна актуальная праблема — незадаволенасць якасцю капітальнага рамонту дома. З ёй звярнулася жыхарка дома № 9 па вуліцы Карбышава. На сустрэчы прысутнічаў і галоўны інжынер ЖКГ Першамайскага раёна. Аргументы і тлумачэнні абодвух бакоў дапамаглі выявіць болевыя месцы праблемы, выпрацаваць алгарытм дзеянняў, які задавальняе і жыхароў дома, і жыллёва-камунальныя службы.

— Тэма ЖКГ актуальная на любых прыёмах грамадзян, — адзначыла Таццяна Рунец. — Усё, што датычыцца капрамонту будынкаў, добраўпарадкавання дваровых тэрыторый, сквераў, паркаў, рамонту дарог і пешаходных сувязяў, хвалюе жыхароў не толькі Мінска, але і ўсёй краіны. Зразумела, вырашэнне ўсіх пытанняў павінна знаходзіцца ў кампетэнцыі мясцовых органаў улады. Скаргі, якія ўзнікаюць, сведчаць аб тым, што ўлада на месцах часам не дапрацоўвае.

Гаворачы аб выніках выязнога прыёму, Таццяна Рунец адзначыла плённасць такой формы работы з выбаршчыкамі.

— Людзі прыходзяць на прыём не з нейкімі імгненнымі адцягненымі або надуманымі пытаннямі. Яны гавораць пра самае для іх важнае, імкнуцца атрымаць адказ на месцы. Беларусь пазіцыянуе сябе як сацыяльна арыентаваная дзяржава, і, прыходзячы на прыём, людзі бачаць, што яно так і ёсць. Іх пажаданне або праблема пачутыя, узятыя на кантроль, а значыць, будуць вырашаны. У сваю чаргу для нас не менш важна бачыць увесь зрэз запытаў грамадзян краіны, ведаць, што сёння найбольш актуальна, каб прымяняць сацыяльныя пасылы грамадства ў заканадаўчай дзейнасці, — падкрэсліла яна.

Алена КРАВЕЦ, фота аўтара.

З ВЫЕЗДАМ НА МЕСЦА

Звароты грамадзян знаходзяцца на пастаянным кантролі сенатараў не толькі ў вызначаныя дні прыёму

Sovrep.gov.by

У мінулую пятніцу старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл Русы па даручэнні Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай разгледзеў з выездам на месца зварот жыхароў вёскі Ракіні Капыльскага раёна з удзелам старшыні Капыльскага раённага выканаўчага камітэта Сяргея Пілішчыка.

Пытанні датычыліся добраўпарадкавання мясцовых дарог, аказання медыцынскіх кансультацый і паслуг насельніцтву ў Салігорску (не па месцы пражывання) з-за некарэктна складзенага раскладу руху грамадскага транспарту.

Па выніках разгляду звароту парламентарыем дадзены даручэнні кіраўніцтву Мінскага абласнога выканаўчага камітэта і Капыльскага раённага выканаўчага камітэта.

Згаданыя пытанні знаходзяцца на кантролі Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, паведамілі ў Савеце Рэспублікі.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. **Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;

e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 12.768. Нумар падпісаны ў 19.30 17 студзеня 2023 года.

БЕЛАРУСБАНК

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

ПО ПРОДАЖЕ ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Могилевское областное управление № 700 ОАО «АСБ Беларусбанк»

Наименование объекта продажи	**Капитальные строения (производственно-хозяйственный блок, здание гаражей и пр.) с инвентарными номерами (700/С-11437, 700/С-11439, 700/С-69748, 700/С-69745, 700/С-69747, 700/С-69742, 700/С-69739), расположенные по адресу: г. Могилев, ул. 30 лет Победы, 3**
Начальная цена продажи	295424,71 руб. (двести девяносто пять тысяч четыреста двадцать четыре рубля 71 копейка), в т. ч. НДС 20 % – 49237,45 руб. (сорок девять тысяч двести тридцать семь рублей 45 копеек)
Сумма задатка	14771,24 (четырнадцать тысяч семьсот семьдесят один рубль 24 копейки) – 5 %
Открытый аукцион состоится	**21.02.2023 в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, д. 71А-2, первый этаж, актовый зал**
Заявления и документы на участие принимаются	В рабочие дни с 9.00 до 16.00 по 20.02.2023 включительно по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 71А-2, пятый этаж, кабинет 502
Продавец	ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается с ОАО «АСБ Беларусбанк» (г. Минск) и регистрируется в органе по государственной регистрации по месту нахождения объекта
Контактные данные	По вопросам, связанным с объектом продажи, обращаться по телефонам: (8-0222)-752155, моб. 8029-169-39-68

Для участия в открытом аукционе представляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка в размере 14771,24 белорусских рубля на счет № BY69 AKBB 6670 8597 0000 2000 0000 БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912.

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования, а также копии учредительных документов юридического лица;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданной обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на русский или белорусский язык;

гражданином Республики Беларусь – копия паспорта (стр. 25, 31, 33);

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на русский или белорусский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном порядке.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором открытого аукциона с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Заключительная регистрация участников аукциона – 21 февраля 2023 г. с 10.30 до 10.55. В случае нерегистрации в вышеназванное время участник не допускается к участию в аукционе. Аукцион по продаже недвижимого имущества будет проводиться с повышением цены. Шаг аукциона – 5 % от первоначальной цены. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победителем аукциона возмещаются затраты на организацию, проведение аукциона и затраты по оценке зданий в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата предмета аукциона осуществляется денежными средствами по безналичному расчету.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан в течение 30 банковских дней с момента утверждения организатором аукциона протокола о результатах аукциона. Победитель аукциона возмещает фактические затраты на подготовку и проведение аукциона.

Центр Промышленной Оценки • Организация аукционов • Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by
Продавец	ОАО «Сбер Банк», 220030, г. Минск, пр-т Независимости, 32А-1
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by

Предмет электронных торгов: лот № 1 – капитальное строение, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. Комсомольская, 11А	Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб.
Здание банка (здание специализированное финансового назначения) общей площадью 1 495 кв. м, инвентарный номер 240/С-13688. Составные части и принадлежности: тамбур, подвал, чердак, гараж. **Обременение:** аренда	**696 530,88**
Сведения о земельном участке с кадастровым номером 242400000001000572: предоставлен на праве постоянного пользования для Оршанского отделения «Белпромстройбанка» общей площадью 0,0462 га	
Лот № 2 – капитальное строение, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 19Б/5	
Магазин (здание специализированное розничной торговли) общей площадью 1176,8 кв. м, инвентарный номер 500/С-22967	**483 929,57**
Сведения о земельном участке: предоставлен на праве общего долевого постоянного пользования (доля 131/625) для реконструкции существующих зданий и сооружений под торговые павильоны и строительство новых зданий, сооружений и торговых павильонов рынка по продаже строительных, электротехнических, сантехнических материалов и оборудования общей площадью 7,7471 га	
Лот № 3 – имущество, реализуемое одним лотом, по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Пушкина, 172	
1. Здание банка (здание нежилое) общей площадью 2124,2 кв. м, инвентарный номер 710/С-52251. Составные части и принадлежности: подвал. **Обременение: аренда.** **2. Помещение гаражей** (помещение транспортного назначения), общей площадью 41,6 кв. м, инв. номер 710/D-54201. **3. Складское помещение** (складское помещение), общей площадью 41,3 кв. м, инв. номер 710/D-54202. **4. Тепловая сеть** (сооружение специализированное энергетики), протяженностью 71,2 кв. м, инв. номер 710/С-73150, по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Пушкина, тепловая сеть по ул. Пушкина, ул. К. Либкнехта от ТК-1005/1 до ТК-1005	**1 661 509,33**
Сведения о земельном участке с кадастровым номером 741000000006001659: предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания Первомайского отделения ОАО «Белпромстройбанк» в г. Бобруйске общей площадью 0,2969 га	
Дополнительная информация по лотам №№ 1, 3: при приобретении предмета аукциона победитель аукциона или единственный участник аукциона заключает с Продавцом договор купли-продажи имущества, относящегося к предмету аукциона. Состав имущества и цены размещены на сайте организатора аукциона www.cpo.by и www.ipmtorgi.by	
Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ» г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки»**	
Срок подписания договора купли-продажи: 10 рабочих дней после электронных торгов	
Условия оплаты предмета электронных торгов: не более 30 дней со дня заключения договора купли-продажи	
Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by	
Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **0,7 %** от цены продажи лота № 1 **и 0,5 %** от цены продажи лотов №№ 2, 3	
Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия	
Дата и время начала и окончания электронных торгов	Начало торгов: 10.00 **10.02.2023.** Окончание торгов: 12.00 **10.02.2023.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **09.02.2023** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by
Контактные данные	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

Центр Промышленной Оценки • Организация аукционов • Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5
Продавец	ОАО «Ивацевичдрев», Брестская обл., г. Ивацевичи, ул. Загородная, 2
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б
Адрес ЭТП	**www.ipmtorgi.by**
Предмет электронных торгов	
Четырехкомнатная квартира (80,4 кв. м, инв. № 122/D-7119, в состав квартиры входит кладовая в подвале). Адрес: **Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Ивацевичи, ул. В. Клютко, 35-6**	
Начальная цена лота (без НДС) – 54 007,77 бел. руб. (снижена на 35 %)	
Задаток **10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ, БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»	
Срок подписания договора купли-продажи: 15 рабочих дней после проведения аукциона	
Условия оплаты предмета электронных торгов	
Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 календарных дней после заключения договора купли-продажи	
Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by	
Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить продавцу и организатору торгов затраты на их проведение и оплатить организатору торгов установленное вознаграждение **6 %** от итоговой цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте: www.cpo.by	
Предыдущее извещении о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда от 30.11.2022	
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия	
Дата и время начала и окончания электронных торгов: 02.02.2023 с 11.00 до 12.00. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов. **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 01.02.2023 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by)**	

Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by

---

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Гродненскому областному потребительскому обществу.

Аукцион состоится 06.02.2023 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71

Лот № 1	
Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона	ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 440/С-9547 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина), общей площадью 146,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Ошмяны, ул. Борунская, 36 с пожарной сигнализацией ППК А6-06. Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 424950100001002033, площадью 0,0408 га (назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли (для обслуживания здания магазина)), расположенном по адресу: г. Ошмяны, ул. Борунская, 36. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в водоохранных зонах рек и водоемов, код – 2.4, площадью 0,0408 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5.2, площадью 0,0002 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений канализации, код – 5.5, площадью 0,0015 га
Начальная цена продажи	52 905,60 руб. (пятьдесят две тысячи девятьсот пять рублей шестьдесят копеек) с учетом НДС
Сумма задатка	5 290 руб. (пять тысяч двести девяносто рублей)
Реквизиты для перечисления задатка	BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225
Место, дата и время окончания приема заявлений	Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 02.02.2023 г. до 15.00**
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 04.06.2021 г.	
Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony	

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Кореличская сельхозтехника».

Аукцион состоится 08.02.2023 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71

Лот № 1	
Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона	ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 431/С-4586 (назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – двухэтажное кирпичное здание проходной), площадью 361,6 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская область, г. п. Кореличи, ул. Гастелло, 18. Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 423355100001001561, площадью 0,2060 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания проходной с навесом) по адресу: г. п. Кореличи, ул. Гастелло, 18. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, площадью 0,0152 га
Начальная цена продажи	9 360 руб. (девять тысяч триста шестьдесят рублей) с учетом НДС
Сумма задатка	936 руб. (девятьсот тридцать шесть рублей)
Реквизиты для перечисления задатка	BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225
Место, дата и время окончания приема заявлений	Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 06.02.2023 г. до 15.00**
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 25.05.2022 г.	
Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony	

Хто каго?

Вася марыў жыць прыгожа:

яхты, мора, падарожжы...

Што было — было, Нікулін расказваў. Значыць, вечар на дварэ, цягнік, купэ — два спадарожнікі. «Каторая гадзіна?» — пытае малады чалавек у пажылога. Той, рабін, хіба цяжанька ўздыхае ды адварочваецца спінай — спіць як быццам.

Раніцай цягнік прыязджае ў Бабруйск, абодва пасажыры збіраюцца выходзіць. «Вы ў мяне пыталіся, каторая гадзіна? — успамінае раптам старэйшы. — Дык вось: зараз палова дзявятай». — «Але ж цяпер гэта мне без патрэбы, — кажа маладзён. — Чаму вы ўчора змаўчалі?» «О-о-о... Калі б я вам учора сказаў, каторая гадзіна, вы б у мяне спыталі, куды я еду. Я адказаў бы, што еду ў Бабруйск. Вы сказалі б, што таксама, а начаваць няма дзе... Я па дабраце душэўнай запрасіў бы вас да сябе дамоў, у мяне там — даруслая дачка. Вы адразу ж затлумілі б ёй галаву, яна б зацяжарала, і вам прыйшлося б жаніцца...» «Ну і што з таго?!» — не разумее малады чалавек. «Я гэтаксама ўчора падумаў, — уздыхнуў рабін. — На халеру мне зяць без гадзінніка?»

Згадзіцеся, у той дарослай дачкі бацька быў на дзіва абачлівы: у яго развагах столькі логікі...

У нашых чытачоў, трэба сказаць, не менш, прынамсі, многія з іх, уважліва паглядзеўшы на чарговы конкурсны здымак (уверсе), усміхнуліся, падумалі і...

«На гэты раз, каб скласці подпіс, — піша **спадар Мікалай Старых з Гомеля**, — я скарыстаўся метадам акынаў, іншымі словамі, што бачыў, тое рыфмаваў. Ну сапраўды: адзін мужчына ў лодцы, двое — да бабкі не хадзі — у клопаце. Адкуль...

Можа, нецвярозым
дзядзька сёння быў?
На лясную сцежку
ранічкай «прыплыў»...
Хіба ж выпадае
тут яго кідаць?
Трэба разам з лодкай
на буксір узяць.

Справа гэта, відавочна, не з простых: тут бы параіцца з некім — разумнейшым, старэйшым, але ж...

Няма з кім, як лічыць **спадарыня Соф'я Кусянкова з Рагачоўшчыны.** Ад яе — маналог маладых:

— Ну чаму з табою, дзед,
Нам заўсёды столькі бед?!
Як цябе ў тваёй байдарцы
Перавезці ў іншамарцы?
...Дзед, каб мог,
дык падказаў,
Але ж лыка не вязаў.

Чаму? Ды зноў відавочна: прынамсі, **спадарыні Любові Чыгрынавай з Мінска:**

Не сусветныя рэкорды
Тройка мелася пабіць:
Планавала на прыродзе
Лодку добра замачыць...

(Будзем спадзявацца, *без* весляра, хоць аднаму з іх, помніцца, і абяцалі «Я убью тебя лодочник»?)

Аднак там — была сцэна, песня... Тут — проза жыцця. І калі лодку (кажуць, што купляць яе трэба ў маладосці, пакуль дурны, а то потым усе грошы пойдуць на саджанцы) мужчыны такі замачылі, дык (паводле **спадарыні Валянціны Гудачковай з Жыткавічаў**) зусім не дзіва, што...

Часам нейчыя мужы
Бавяць час у гаражы.
Тут —
інакшая карціна:
Тут —
мужчыны, як мужчыны!
Утраіх прыдбалі лодку,
І грабуць сабе ў ахвотку.

Трэба разумець, па чарзе, уступаючы яе старэйшым, ці...

Здагадка ад **спадара Аляксандра Матошкі з Расоншчыны:**

Трое, едучы з бяседы,
Пасадзілі ў лодку дзеда:
— Вось ён,
твой азёрны край:
Хоць сядзі,
хоць адплывай!
...Мусіць дурнямі былі:
Хто ж вяслуе па зямлі?

Вось на гэты конт здагадак шмат. Чытайце (ад **спадара Віктара Сабалеўскага з Узды):**

Дзед
не рыбу вучыць плаваць.
Маладым бы расказаць,
Як трымаць сваю паставу,
Як вясло не заглыбляць...
Доўга б лекцыю чытаў,
Калі б хтосьці не спытаў:
Можа, разам паплыві б?..
Самі вы ў вадзе былі?

На гэтае пытанне, што называецца, няма адказу. А вось меркаванні ёсць: у таго ж **спадара Матошкі**):

У Падазёркі
рана-рана
Газавалі апантана...
Але сплаваць не ўдалося:
Бо з сабой не ўзялі вёсел.
І што хочаш тут рабі:
Хоць ты кепкаю грабі!

(З дыялогаў: «Ты куды? На паляванне? У навальніцу?» — «Дык яна і ў суботу была... Дзед такога зайца прынёс!.. Маланкай забіла»).

Што ж — бываюць у жыцці і радасці, і засмучэнні. Апошнія — на думку **спадара Валерыя Гаўрыша з Чавусаў** — як правіла, за дурной галавой:

У суботку рыбакі,
Падрулілі да ракі.
Упохапкі збіраліся —
З матам разгружаліся:
— Блін —
няма чым веславаць!
— ...Рыбу з рэчкі
падымаць.
І заплечнік недзе дома...
— У ім — гарэлка і яда?!
Вось найгоршая жуда!

(Нішто не робіць вячэру такой смачнай, як адсутнасць абеду.)

Пра яе, жуду, прыкладна такую ж (калі іншых няма...), і радкі **спадарыні Чыгрынавай:**

Па даросе да ракі
Дзед — вясёлы,
гаваркі —
Свайго ўнука
так хваліў,
Бо чакаў, каб той наліў...
Але ж выйшла,
неспадзеўкі (!),
Унук
забыўся ўзяць гарэлкі...
Памяняўся мігам дзед
Крые матам
на ўвесь свет!

(Запіс у школьным дзённіку: «Ваш сын адзіны, хто ў паход узяў спіртное. Дзякуй вам за сына!»)

З таго ж самага «канверта» (не блытаць з дзённікам) і пра тых самых мужчын (са здымка... Можна яшчэ раз глянуць на верхні) і дарэчнае:

Пагублялі снасці —
Закіпелі страсці...
Стаў чыхвосціць
дзед унука:
«А бязглузды! А бязрукі!..»
Ты спыніўся б
у кляцьбе!
Хлопец — копія цябе:
Усе крошачкі пабраў —
Яблык побачкі ўпаў!

Спадарыня Любоў Чыгрынава ў гэтым не сумняваецца, **спадар Аляксандр Матошка** — таксама:

Выбачаецца Янук —
Міхася старога ўнук:
— Ну, забыўся вёслы
недзе...
На «рэно» дамоў
паедзем —
Так хутчэй...
Ды дзедка —
дзе там
Ён у гонары задзеты:
— Не дуры мне галаву
Я байдаркай паплыву!

Дзед, трэба разумець, — чалавек адважны. Унук, на думку **спадара Сабалеўскага,** не такі (фемінізм — да першага мужчыны, камунізм — да першага капіталу, атэізм — да першай гайданкі ў самалёце), бо:

Рассякала воды шпарка
Легкакрылая байдарка!
Але ж ганьбу даў ёй Коля:
— Я туды не сяду болей,
Вельмі вузкая...
баюся,
Раптам недзе навярнуся.

А дзед тым часам «плыве», прычым, на думку **аршанца Мікалая Камароўскага,** яшчэ і як:

Была нялёгкаю дарога,
Каб парыбачыць,
«дзе — нікога»:
Імчаліся на «масквічы»...
Прыехалі...
Тут памаўчым
І нават пашкадуем
хлопцаў:
Іх апярэдзілі на... лодцы.

Што, дарэчы, зусім не дзіўна, бо, як нагадвае **спадарыня Соф'я Кусянкова,**

Як ты лодку назавеш,
Так у ёй і паплывеш.
Дзед імя даў — БМВ,
Па зямлі ў ёй «плыве»:
Без патрэбы веславаць,
Але і ногі не трапаць.

Што сапраўды, калі ёсць кірунак. Дыялог маладзейшых (паводле **спадарыні Гудачковай**), калі няма:

— Ні знаку
сцежкі ў траве!
Хоць да вады
была ж дарога!..
— Хай дзед на лодцы
«праплыве»,
З п'яным
не здарыцца нічога.

Іх, кажуць, і сапраўды бог любіць, толькі долі не дае.

А калі наогул, то кампанія на здымку, вядома ж, цікавая. Ну вось уявіце (прапанова з таго ж канверта):

Трое...
Укуляцца ў байдарку...
Там, за дрэвамі,
канал...
Каб да іх яшчэ аўчарку,
Быў бы новы серыял.

І там, ну вядома ж, — галоўны герой. Хто? Ды гэта, паводле **спадара Матошкі,** відавочна**:**

У дзеда — скварка!
У дзеда — чарка!
У дзеда —
новая байдарка!
Не папльць,
дык пасядзець...
Прыязджайце паглядзець!

Прычым — без адкладу на вясну ці лета, прыязджайце, зараз і пакуль не позна, бо, як мяркуе **спадар Віктар Сабалеўскі**):

Хто ж не марыў
жыць прыгожа:
Яхты, мора, падарожжы
(Ды яшчэ зімой —
у лета),
Пляж, «музон»,
віно, кабеты...
Ёсць!
Рамантык той у лодцы!
Да вады прывезлі хлопцы:
Патрымаў вясло ў руках...
І адчуў, што справы швах.

З гадамі, як той казаў, усё больш расчароўваюць цэны, люстэрка і аналізы. А «дэпрэсняк» — гэта калі паветраны замак разбурыўся і прыдушыў будаўніка. (Анекдот: два браткі прыходзяць на свежую магілу трэцяга. «А што тут трэба сказаць?» — пытае адзін другога. «Ды як быццам штосьці пра пух». «Ну тады, Віцёк, ні пуху табе, ні пяра!»...

Гэта — услед, потым — надпіс на помніку: «Пры жыцці мне бывала добра, але каб так, — ніколі!).

Зрэшты, не будзем аб сумным, будзем аб вясёлым (з «падачы» **сужэнцаў Астроўскіх з Мінска**):

Гарадскіх людзей заўсёды
Вабіць да сябе прырода:
Выязджаюць —
і з ахвотай —
У лясы ды на балоты...
А ў нас свае задачы —
Нешта вырасціць на дачы!

Пахвальнае жаданне! Дай бог сіл і поспеху! А вось знаёмцам **спадара Мікалая Касмачэўскага з Навапалацка**, у якіх, падобна, ні сораму, ні сумлення — нічога лішняга, мы таго ж пажадаць не можам, бо

Ходзяць чуткі-пагалоскі,
Што Нічыпар,
дзядзька з вёскі,
З зяцем і сваім унукам
Сеткі зноў бяруць у рукі
І ў час нерасту рыбачаць,
Дзе нагляд іх
не ўбачыць...
Ад звяздоўца Клешчука
Не схавацца рыбакам.

Вось гэтым камплімент на адрас нашага і сапраўды ўсюдыіснага фотакарэспандэнта і можна было б завяршыць чарговы конкурсны агляд, калі б не два кароткія, але ж дарэчныя — да здымка — радкі **мінчаніна Эльяша Банеля**:

Колам стала іншамарка?
Можа выручыць байдарка!

Дай бог, каб у тых, хто за рулём, заўсёды былі запасныя варыянты, а ў нас, звяздоўцаў, яшчэ і варыянты подпісаў да конкурсных здымкаў.

...На мінулым (гл. нумар «Звязды» за 9.11. 2022 г.), нагадаем, быў мужчына, які не тое прыбіваў, не тое здымаў дарожны паказальнік каля вёскі з прыгожай назваю Рай. Дык вось найлепшыя радкі пра яго (паводле вялікага чытацкага журы) атрымаліся ў **спадароў Віктара Сабалеўскага з Узды, Эльяша Банеля з Мінска, Валерыя Гаўрыша з Чавусаў, у спадарынь Валянціны Гудачковай з Жыткавічаў, Любові Чыгрынавай з Мінска і Соф'і Кусянковай з Рагачоўшчыны.** Яе радкі *«Абяцаў Іванка Раі: Будзеш жыць са мной у раі!.. Што для гэтага зрабіў? Шыльду ля двара прыбіў»* маленькае рэдакцыйнае журы палічыла вартым перамогі і прыза ў выглядзе квартальнай падпіскі на дарагую сэрцам «Звязду».

Хочаце, каб яна, «родная на роднай мове, пяць разоў на тыдзень прыходзіла да вас, тады варыянтаў два: альбо афармляць падпіску, альбо ўважліва паглядзець на чарговы конкурсны здымак, прыдумаць дасціпны подпіс (можна некалькі, але не больш за восем радкоў) і даслаць у рэдакцыю. Шанц на перамогу мае кожны. Поспехаў!

Валянціна ДОЎНАР.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Казачны баль у Вялікім

Стары Новы год у Вялікім тэатры оперы і балета сустрэлі традыцыйным балем. Сёлета ён стаў ужо чатырнаццатым. Шмат танцаў, музыкі, усмешак, прыгажосці і чараўніцтва. Каб сто пар маглі кружыцца па зале лёгка і нязмушана, з імі на працягу двух месяцаў займалася балетмайстар, заслужаная артыстка Беларусі Юлія Дзятко. Варта адзначыць, што кожны год яна рыхтуе новую праграму.

У гэтым годзе тэмай балю сталі чароўныя казкі. Усё свята было арганізавана пад кіраўніцтвам галоўнага рэжысёра тэатра, аўтара канцэпцыі Ганны Маторнай. Вечарына пачалася з класічнай часткі — двух баляў, Каралеўскага і Венскага. Пасля танцаў удзельнікаў чакаў вялікі канцэрт «Дзеці і чараўніцтва». Ён быў напоўнены разнастайнымі музычнымі кампазіцыямі: ад оперных арый да папулярных калядных песень. Акрамя гэтага, госці маглі прыняць удзел у караоке з зоркамі, займальных квэстах і майстар-класах па танцах, а таксама зрабіць фотаздымкі ў разнастайных фотазонах.

Свята скончылася далёка за поўнач відовішчным шоу на адкрытым паветры ад Тэатра вогненных і светлавых уяўленняў. А мы прапануем паглядзець на яго асобныя імгненні.

Лізавета ГОЛАД.

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества унитарного производственного предприятия «СИЛУМИН» ОАО завода «ВИЗАС»

Лот	Наименование	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1	Печь электрическая плавильная ЭСТ-250, инв. № 00000011, г. в. 2007	954,00	95,40	47,70
2	Печь электрическая плавильная ЭСТ-250, инв. № 00000012, г. в. 2007	954,00	95,40	47,70
3	Тигель, г. в. 2007	180,00	18,00	9,00
4	Тигель, г. в. 2007	180,00	18,00	9,00
5	Тигель, г. в. 2007	180,00	18,00	9,00

В отношении вышеуказанного имущества проводятся пятые повторные торги. **Стоимость снижена на 85 %.** Ранее публикация о торгах размещалась в газете «Звязда» № 183 (29805) от 17.09.2022, 15 стр., № 217 (29839) от 04.11.2022, 15 стр., № 231 (29853) от 24.11.2022, 11 стр., № 241 (29863) от 08.12.2022, 14 стр., № 253 (29875) от 24.12.2022, 6 стр.

Местонахождение: г. Витебск, пр-т Фрунзе, д. 83

Дата и время проведения торгов	**31 января 2023 года в 14.30 (регистрация с 14.00 до 14.25)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127
Срок приема заявлений и внесения суммы задатка	**С 10.00 18 января 2023 года до 16.00 27 января 2023 года**

Условия для участия в торгах:
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», УП «СИЛУМИН» ОАО завода «ВИЗАС», проводимых 31.01.2023.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
